ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 5 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

№ 6 1932 Менск 21 красавіка

ОРГАН ФЭДЭРАЦЫІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І ГАЛОЎМАСТАЦТВА БССР

НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

(Да пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

На сакавіковым аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК КП(б)Б ва ўсю шырыню быў пастаўлены на абмеркаваньне ўвесь комплекс складаных пытаньняў, зьвязаных з нашай культурнай рэволюцыяй, з ленінскім нацыянальна-культурным будаўніцтвам у Савецкай Беларусі.

Пленум падкрэсьліў буйнейшыя посьпехі і перамогі БССР у галіне культурнага будаўніцтва, якія зьявіліся «на аснове разгорнутага гаспадарчага будаўніцтва, цьвёрдага і няўхільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, якія «зьяўляюцца рэзультатам надзвычайнага росту актыўнасьці найшырэйшых рабочых, колгасных і бядняцка-серадняцкіх мас БССР, рэзультатам цьвёрдага і няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, і разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элемэнты краіны».

Падагуліўшы нашы посьпехі і перамогі на ўсіх вучастках культурнага фронту, пленум адзначыў, што гэтыя посьпехі, што ўсё будаўніцтва беларускай пролетарскай культуры праходзіла і праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і мобілізаваў увагу партыі на далейшую рашучую барацьбу супраць усякіх скажэньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі, супраць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі, супраць опортуністычнага прымірэнцтва да яго, супраць беларускага шовінізму, супраць усялякіх праяўленьняў нацыянал-опортунізму і нацыянал-дэмократызму, супраць шовінізмаў іншых колераў і адценьняў, супраць усякіх шкодных і варожых вылазак, уплываў і тэорый на ўсіх вучастках культурнага фронту.

Пленум патрабаваў бальшавіцкага разгортваньня і ажыцьцяўленьня задач культурнай рэволюцыі ў сувязі з сусьветна-гісторычнымі задачамі, якія паставіла XVII усесаюзная партконфэрэнцыя: **«Канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў экономіцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага соцыялістычнага грамадзтва».**

Як на адну **з асноўных і першачарговых задач** на даным этапе соцыялістычнага будаўніцтва для ўсіх партыйных, культурна-асьветных організацый на фронце культурнай рэволюцыі пленум паказаў на барацьбу за павышэньне якасьці культурнай работы, за рэалізацыю шасьці ўказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна, за марксысцка-ленінскую мэтодолёгію.

Падагуліўшы посьпехі і перамогі на культурным фронце і, даўшы ім бальшавіцкую ацэнку, пленум вызначыў далейшыя задачы і пэрспэктывы для ўсіх вучасткаў культурнага будаўніцтва; у галіне ўсеагульнага навучаньня, падрыхтоўкі кадраў, работы сярод інтэлігенцыі, навукова-дасьледчай работы, у галіне тэорытычнай работы, у галіне выдавецтва, у галіне разьвіцьця мастацтва, масавай культурна-асьветнай работы, у галіне друку і партыйнага выхаваньня.

Пастановы пленуму, якія маюць выключнае значэньне ў справе далейшага пашырэньня і ўмацаваньня ўсяго фронту ленінскага нацыянальна-культурнага будаўніцтва, павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй нашай штодзеннай практычнай работы па стварэньню бальшавіцкага мастацтва, як у галіне пролетарскай літаратуры, а таксама ў галіне тэатру, кіно, выяўленчага мастацтва, музыкі і г. д., у аснову далейшай пасьпяховай перабудовы ўсёй сыстэмы нашай работы ў сэнсе яшчэ больш шчыльнага набліжэньня да задач соцыялістычнага будаўніцтва, ліквідацыі адставаньня мастацкага фронту ад агульных тэмпаў і ўзроўню соцыялістычнага будаўніцтва, у сэнсе наданьня сапраўднай бальшавіцкай якасьці нашай работы, прасякненьня нашай творчай продукцыі бальшавіцкай ваяўнічай партыйнасьцю, бальшавіцкай непрымірымасьцю да ўсяго шкоднага і варожага, што ставіць перашкоды на нашым пераможным шляху.

Для пролетарскай літаратуры БССР паўстае задача рашучай барацьбы за поўную гегемонію пролетарскай літаратуры. Калі на сёнешні дзень пролетарская літаратура зьяўляецца ідэёва-вядучым атрадам у дачыненьні да ўсёй савецкай літаратуры, то ў творчых адносінах гэтага сказаць яшчэ нельга, ня гледзячы на шэраг пасобных твораў, якія па сваёй мастацкасьці пакідаюць ужо за сабой творы буржуазнай, дробнабуржуазнай і спадарожніцкай беларускай літаратуры.

Важнейшымі ўмовамі для хутчэйшай заваёвы гегемоніі пролетарскай літаратуры зьяўляецца сапраўдная бальшавіцкая самакрытыка, бальшавіцкія тэмпы ў перабудове ўсёй сыстэмы работы пролетарскай літаратурнай організацыі, якой зьяўляецца БелАПП, рашучае перамаганьне дапушчаных памылак, разгорнутая вучоба па больш глыбокаму авалоданьню марксысцка-ленінскім сьветапоглядам, узьняцьце тэорытычнай работы крытычных сіл організацыі на ўзровень поўнага асваеньня філёзофіяй марксызму-ленінізму, марксысцка-ленінскай мэтодолёгіяй. Зусім правільна адзначала газэта «Зьвязда», што **асноўнай** прычынай, якая тармозіць перабудову БелАПП, **зьяўляецца слабое разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі («Зьвязда» № 84 ад 14 красавіка г. г.).** Трэба адкрыта сказаць, што ў паасобных таварышоў з БелАПП самакрытыка яшчэ не ў пашане. Некаторыя таварышы спрабуюць тлумачыць свае памылкі выключна сваёй тэорытычнай непадрыхтаванасьцю, характарызуюць усе памылкі БелАПП, як выключна толькі «памылкі росту». Такога роду заявы нічога агульнага з сапраўднай самакрытыкай ня маюць. Няма, зразумела, ніякага сумненьня ў тым, што памылкі БелАПП адбываліся ў процэсе росту беларускае пролетарскае літаратуры, у процэсе жорсткай барацьбы БелАПП супраць усякіх варожых плыняў і ўплываў на літаратурным фронце. Але-ж нельга забываць і таго, што шмат якія з гэтых памылак зьявіліся ў выніку клясава-варожых нам уплываў, у выніку чуждых нам тэорый і тэорыек.

Адсюль паўстае важнейшая задача: самым сур'ёзным чынам прааналізаваць гэтыя памылкі, выявіць іх варожыя соцыяльныя карэньні, па-бальшавіцку выправіць гэтыя памылкі. Гэтымі днямі адбудуцца чарговыя вечары творчай дыскусіі ў МенАПП'е і БелАПП'е, прысьвечаныя крытыцы работ нашых крытыкаў. Тут патрэбна будзе бальшавіцкая пільнасьць, выключная дбайнасьць для таго, каб накіраваць дыскусію па правільнаму рэчышчу, каб, падвяргаючы жорсткай крытыцы і самакрытыцы работы нашых пролетарскіх крытыкаў, у той-жа час рашуча адбіць усякія спробы агульнага ахайваньня нашага крытычнага фронту, прыдзіркі да дробязяў, ня маючых прынцыповага характару, няправільныя і шкодныя абагуленьні. Асноўнай задачай гэтых вечароў дый наогул усёй нашай штодзеннай практычнай работы павінна быць барацьба за сапраўдную ленінскую літаратурную крытыку.

У сувязі з пастановамі пленуму перад намі паўстае і цэлы шэраг задач у галіне работы са спадарожнікамі ў літаратуры і ў мастацтве ў справе набліжэньня іх да пролетарыяту, у справе ператварэньня спадарожніка ў саюзьніка пролетарыяту. Мы дапамагаем спадарожнікам авалодаць марксысцка-ленінскім сьветапоглядам, дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтадам. Мы павінны ім дапамагчы і ў авалоданьні неадрыўнай часткай марксысцка-ленінскага сьветапогляду—гэта прынцыпамі пролетарскага інтэрнацыяналізму, дапамагчы пазбавіцца ад рэштак і перажыткаў дробнабуржуазнага нацыяналізму. Разам з конкрэтнай таварыскай дапамогай спадарожнікам у перабудове іх творчых шляхоў, мы павінны даваць самы рашучы адпор усякім «лявацкім» вульгарызатарскім наскокам на спадарожнікаў, «лявацкім» установкам у задачах перавыхаваньня спадарожніцкіх мас накшталт хаця-бы такога, з дазволу сказаць, лёзунгу: «саюзьнік, альбо вораг». А такія настроі, такія тэндэнцыі часам маюць свае праявы і на нашым літаратурным фронце. Зусім зразумела, што дапамагаючы спадарожніку стаць на рэйкі саюзьніцтва, **а саюзьніку на** рэйкі пролетарскай літаратуры, мы ў той-жа час павінны рашуча змагацца з усякімі рэшткамі дробнабуржуазнай ідэолёгіі ў творчасьці спадарожнікаў, з усякімі праявамі варожай нам буржуазна-кулацкай ідэолёгіі. Асаблівае значэньне ў рабоце са спадарожнікамі ў літаратуры набываюць ажыцьцяўленьне работы БелФАСП і організацыя Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі.

Вывучаючы пастановы ЦК і ЦКК праводзячы іх ў конкрэтнае жыцьцё, мы тым самым забясьпечым яшчэ больш хуткі і пасьпяховы рост нашага мастацтва, узьнімем яго на вышэйшую ступень, забясьпечым яму бальшавіцкую якасьць, бальшавіцкія тэмпы ў перабудове ўсёй сыстэмы работы літаратурных і мастацкіх організацый.

Міхась Лынькоў.

Дзьве аповесьці пра прымежжа

Да XV гадавіны Кастрычніка пішу дзьве аповесьці. У першай хочу паказаць адзін з нашых «глухіх кутකоў» ля самай савецка-польскай мяжы. Прымежны колгас, выкрыцьцё шкодніцкіх элемэнтаў унутры колгасу, гаспадарчае ўмацаваньне колгасу, дапамога прымежнікаў чырвонаармейцаў за ўсёй гэтай працы, удзел чырвонаармейцаў у павялічэньні культурнага ўзроўню колгасьнікаў—вось прыблізныя вехі аповесьці. Спэцыфічныя ўмовы жыцьця прымежжа, дзе я пражыў у мінулую восень цэлы месяц, даюць мне магчымасьць насыціць фон аповесьці такімі рыскамі, якіх няма ў іншых мясцовасьцях нашай рэспублікі. Як напр., частыя пераходы з таго боку дзесяткаў людзей з бядняцкай часткі сялянства, закатаваных і пакалечаных панскімі жандарамі і розныя іншыя зьявы прымежнага жыцьця.

Другая аповесьць—малюнак з жыцьця грамадзянскай вайны ў 1920 годзе, з тых часоў, калі была ўстаноўлена нэйтральная зона паміж БССР і белай Польшчай, калі беларускія эсэры разам з польскай шляхтай спрабавалі «адваяваць» адно мястэчка. Удзел у гэтай справе розных слаёў местачковай насельнасьці, жыцьцё мястэчка ў сучасны момант—сюжэт другой аповесьці.

Зьмітрок Бядуля.

Расьці і тварыць

Хочацца напісаць пра многае.

Перш за ўсё бяруся за пакрыцьцё рахунку ленінскай комсамоліі, прад'яўленага пролетарскай літаратуры. Гэтаму дапаможа актыўны ўдзел у жывой рабоце партыйна - комсамольскіх організацый.

У самай бліжэйшай пэрспэктыве ў мяне—напісаньне новых вершаў пра кіраўнічую ролю партыі бальшавікоў у барацьбе за соцыялізм, вершаў на тэмы жыцьця і работы комсамолу, вершаў пра перарастаньне селяніна-дробнага буржуа ў сьвядомага члена соцыялістычнай грамады.

Працую над поэмай. Зьмест — інтэрнацыянальная еднасьць пролетарыяту і як часткі яго—рабочай моладзі.

Лічу, што кожны наш твор павінен мабілізоўваць на ўзьняцьце абароназдольнасьці СССР.

У асноўным падвожу вынікі ўсёй сваёй папярэдняй поэтычнай работы з тым, каб канчаткова расквітацца з рэшткамі дробнабуржуазнага рызызя ў сьветапоглядзе і працаваць па-новаму — ўзьняць ідэёвы ўзровень творчасьці, дамагчыся большай мастацкай удасканаленасьці.

Думаю, што набліжэньне XV гадавіны Кастрычніка павінна паставіць перад нашым спадарожніцтвам (у прыватнасьці—поэтамі) пытаньне пра **больш рашучую** перабудову свае творчай работы. Гэтага патрабуе далейшы разгорнуты наступ соцыялізму.

хто ў поэзіі—
Толькі тога эпоха прыме,
бальшавік!

Сьцяпан Ліхадзіеўскі.

Паказаць героіку комсамолу

Комсамол пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі адыграў вялікую ролю ў барацьбе за Кастрычнік, за соцыялістычнае будаўніцтва. Загінула шмат адданых таварышоў у барацьбе супроць інтэрвэнтаў - белапалякаў, банд Балаховіча і інш. зграй. Шматмільённая маса комсамолу на перадавых франтох змагаецца за соцыялізм.

Мая задача на бліжэйшы час— паказаць героічнае пакаленьне нашай эпохі, адданых змагароў за Кастрычнік, за соцыялістычнае будаўніцтва. Зараз я працую над раманам з жыцьця комсамолу на вёсцы. Роман будзе ахапляць пэрыод ад вайсковага комунізму да ўступленьня краіны ў соцыялізм.

Да XV гадавіны Кастрычніка падрыхтую першую кнігу роману.

Ц. Зарэчны.

Вартавыя напружаны...

У XV гадавіну Кастрычніка Савецкі Саюз ідзе з надзвычайнымі посьпехамі ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Этап невялікі па гадох, але бурны, грандыёзны па свайму зьместу, вялікі этап!

Калі дзесяць дзён страсянулі ўвесь сьвет, дык можна сабе ўявіць, як трасецца сьвет на парозе шаснаццатае гадавіны жыцьця СССР. Мы маем два сьветы: соцыялістычны і капіталістычны. Ніякай сіле іх не памірыць. Адзін павінен сыйсьці з арэны, выкрэслены чалавецтвам. Гісторыя вядзе гэтыя два сьветы да генэральнага бою. Вартавыя напружаны.

Вартавым нашай пятнаццацігадовай эпохі будаваньня соцыялістычнага сьвету зьяўляецца чырвоармеец.

Яго клясавая пільнасьць зьяўляецца тэмаю мае п'есы, якую я рыхтую да XV гадавіны Кастрычніка.

Васіль Сташэўскі.

Першая літаратурная конфэрэнцыя пагранахраны і войск АДПУ БССР

15-17 красавіка гэтага году працавала першая акруговая літаратурная конфэрэнцыя пагранахраны і войск АДПУ БССР. На конфэрэнцыі брала ўдзел 54 дэлегаты—прадстаўнікі літгурткоў пагранахраны і войск АДПУ і пісьменьнікі.

У склад прэзыдыуму былі абраны таварышы: Матсон, Чарнабыльскі, Залатухін, Герцовіч, Ляхаў, Модэль, Навумаў, Шапавалаў, Гольдман, Самахвалаў, Бэндэ, Лынькоў, Александровіч, Галавач, Броўка, народныя поэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас і інш.

Ад імя БелАПП конфэрэнцыю вітаў тав. Міхась Лынькоў.

Конфэрэнцыя заслухала наступныя даклады:

1. Пагроза вайны і задачы мастацкай літаратуры—т. Л. БЭНДЭ.

2. Падрыхтоўка вайны ў заходняэўропэйскай літаратуры—т. Е. ГАЛЬПЭРЫНА.

3. Паказ герояў-ударнікаў па матэрыялах чырвонаармейскай творчасьці—т. А. САМАХВАЛАЎ.

4. Заклік ударнікаў у літаратуру, формы і мэтоды літаратурнай работы ў пагранчастках—т. Я. ШАПАВАЛАЎ.

У спрэчках па дакладах выступіла каля 50 таварышоў (сярод іх т. т. Навумаў, Александровіч, Галавач, Броўка, Вярнікоўскі, Скокаў і інш.).

На конфэрэнцыі аформлена пагранічная сэкцыя БелЛАЧАФ.

Адказным сакратаром сэкцыі абраны т. Шапавалаў.

На ўсебеларускую конфэрэнцыю ЛАЧАФ абрана 17 дэлегатаў.

Конфэрэнцыя выказалася за выданьне літаратурна-мастацкага пагранічнага часопісу.

Задачы пролетарскага пісьменьніка

З выступленьня старшыні СНК БССР т. Галадзеда на конфэрэнцыі МенАПП



Таварышы, дазвольце мне ад імя Савету Народных Комісараў Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі перадаць вашай конфэрэнцыі бальшавіцкае прывітаньне (воплескі).

Таварышы, зараз рабочая кляса Савецкага Саюзу ня толькі перажывае, але і стварае вялікую новую эпоху ў гісторыі разьвіцьця грамадзтва. Мы ўжо поўнасьцю перайшлі ў эпоху пролетарскіх рэволюцый. Рабочая кляса ўсяго сьвету стаіць на гэтым шляху. Мы-ж у СССР ня толькі знаходзімся ў гэтым пэрыодзе, але і ствараем новую эпоху шляхам пабудовы соцыялізму, фундамант якога мы ўжо ў асноўным пабудавалі. Галоўнай рухаючай сілай і творцам гэтай эпохі зьяўляецца пролетарыят, які праз новыя соцыялістычныя формы па-новаму організоўвае соцыялістычную вытворчасьць. Мы маем у гэтых адносінах (у організацыі соцыялістычнай вытворчасьці) гіганцкія дасягненьні. Пра індустрыялізацыю СССР і ў прыватнасьці—пра БССР я ня буду прыводзіць вам лічбаў. Вам, пісьменьнікам, асноўныя факты нашага прасоўваньня наперад павінны быць вядомы. Мы маем вялізныя дасягненьні ня толькі ў галіне індустрыялізацыі СССР, мы адначасова маем вялікія заваёвы і на самым адсталым і цяжкім вучастку нашай працы і барацьбы. Самае цяжкае, што заўсёды стаяла перад рэволюцыянэрамі—гэта задача ўмець мільёны дробных вытворцаў-сялян далучыць да рэволюцыйнай барацьбы, да соцыялістычнага будаўніцтва, далучыць іх да ўдзелу ў пабудове нашага соцыялістычнага грамадзтва.

Я гэта вам напамінаю для таго, каб зараз пасьля нанясеньня руйнавальнага ўдару па галоўных сілах ворага, мы не супакоіліся на гэтых перамогах, каб нам ня страціць клясавай пільнасьці, каб быць увесь час, як кажуць, напагатове.

Вынікі соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне вялізарныя. Я ня буду прыводзіць факты пра іх і параўноўваць гэтыя вынікі, скажам, з тым, што робіцца ў капіталістычным сьвеце таму, што гэтыя пытаньні шырока асьвятляюцца ў друку. Яны ўсякаму з вас дасканала вядомы. Сутнасьць гэтага параўнаньня двух процэсаў, што адбываюцца зараз, заключаецца ў тым, што ў нас, у СССР, праходзіць магутны рост соцыялізму, а ў іх, у капіталістаў, адбываецца бесьперапынны заняпад і развал капіталізму. У нас рабочая кляса ўсяго Саюзу мобілізуе ўсю сваю творчую энэргію, вышуквае лепшыя новыя соцыялістычныя формы і мэтоды працы і гіганцкімі крокамі ідзе наперад да канчатковай перамогі соцыялізму. У іх—зжабрачаньне мас, зачыненьне заводаў і фабрык, рост арміі беспрацоўных. Значыць, мы перажываем вялікую эпоху перабудовы ўсяго сьвету па рэволюцыйным шляху.

Задачы пролетарскіх пісьменьнікаў заключаюцца ў тым, каб не адставаць ад гэтай эпохі і ісьці ў нагу з пролетарыятам, пад кіраўніцтвам яго авангарду—комуністычнай партыі. Калі пісьменьнік ня будзе захоўваць гэтай асноўнай умовы, дык ён ня будзе пролетарскім пісьменьнікам.

Што такое пісьменьнік наогул? Пісьменьнік-мастак—гэта ёсьць частка концэнтраванай энэргіі перажываемай эпохі. Пролетарскі пісьменьнік павінен быць чалавекам сваёй эпохі, не адставаць ад яе. Калі ён адстане, ён ужо ня будзе пролетарскім пісьменьнікам. Пісьменьнікі павінны ў мастацкай форме концэнтраваным шляхам адлюстроўваць тыя процэсы грамадзкага жыцьця, якія праходзяць на даных гістарычным адрэзку часу.

Што пісьменьніку трэба для таго, каб правільна адлюстроўваць гэтыя процэсы?

Трэба быць ня толькі добрымназіральнікам, стоячы ў баку і фіксуючы ўсе здарэньні, якія адбываюцца ў гэтай эпосе. Гэтага зусім мала, гэта ня ўсё, для таго, каб правільна па-мастацку намаляваць малюнак процэсаў, што адбываюцца, трэба каб пісьменьнік усё добра бачыў і нават прадбачыў, і, зразумела, трэба, каб пісьменьнік, у першую чаргу, многа ведаў. Для пісьменьніка аўладаньне ведамі—гэта задача абавязковая. Бяз гэтага ён ня будзе пісьменьнікам. Але мала і тыўным удзельнікам соцыялістычнага гэтага. Трэба, каб пісьменьнік быў актыўным удзельнікам соцыялістычнага будаўніцтва, г. зн. удзельнікам-творцам перажываемай эпохі. Гэтыя палажэньні павінны быць асноўнымі і яны павінны быць кіруючым пачаткам для работы пісьменьніка, а таксама і для пісьменьніцкіх організацый.

Калі я кажу пра тое, што трэба ня толькі бачыць, але і прадбачыць, дык я ня маю на ўвазе ніякага містычнага прадбачаньня. Я маю на ўвазе тое, каб пісьменьнік на падставе дыялектычнага матэрыялізму, карыстаючыся гэтым марксавым мэтодам, меў-бы магчымасьць правільна аналізаваць тыя процэсы, якія адбываюцца ў перажываемую эпоху, а таксама і здолеў-бы заўважаць новыя процэсы грамадзкага разьвіцьця, якія нараджаюцца.

Вам вядома, што старых пісьменьнікаў дарэволюцыйнага часу мы ацэньвалі ня толькі па тым, наколькі той ці іншы быў моцны ці слабым мастаком, але і па тым, наколькі яму ўдалося заўважыць процэсы, што нараджаюцца, правільна іх асэнсаваць і сваячасова сыгналізаваць аб іх, заклікаць і штурхаць масы да барацьбы за новае жыцьцё.

Пры якіх умовах мог пісьменьнік у дарэволюцыйны час прадугледжваць, куды будзе разьвівацца процэс грамадзкага жыцьця, што нараджаецца? Ён гэта мог бачыць і ў вядомай ступені прадугадваць тады, калі ён мог правільна асэнсаваць праходзячыя процэсы ў грамадзкай вытворчасьці і грамадзкім жыцьці, разумець, куды даны фактар мог разьвівацца, і калі ён браў гэтыя фактары ў іх разьвіцьці, карыстаючыся марксысцкай дыялектыкай.

Перад пролетарскімі пісьменьнікамі гэтая задача стаіць цяпер на ўвесь свой рост. Прычым вам лягчэй бачыць, куды разьвіваецца перажываемая эпоха таму, што мы ўжо ўступілі ў пэрыод соцыялізму, пабудавалі фундамант соцыялістычнай экономікі і поўным ходам будуем соцыялізм. Тое, што ў капіталістычным грамадзтве дарэволюцыйнай эпохі толькі ледзь-ледзь намячалася, зараз знаходзіцца ўжо ў разгорнутым выглядзе і пэрспэктывы організацыі новага бясклясавага грамадзтва перад намі зусім яскрава вырысоўваюцца. Мы гэтыя пэрспэктывы, як кажуць, ужо «осязаем». Вось так я разумею задачы, якія стаяць перад пролетарскімі пісьменьнікамі. Варта яшчэ раз напомніць пра мэтоды Маркса, ужытыя ім пры вывучэньні экономікі таго часу і пры вывучэньні процэсу будучага разьвіцьця грамадзтва.

Вывучаючы экономіку ў момант нараджэньня прамысловага капіталу, Маркс здолеў выявіць у гэтай экономіцы ролю фабрык і заводаў, што нараджаліся, і на іх зрабіць цэлы прогноз, пабудаваўшы цэлую тэорыю на доўгі час і для многіх пакаленьняў, якая заключаецца ў тым, што заводу і фабрыцы—гэта значыць, колектыву новай грамадзкай клясы—рабочым—належыць уся будучыня.

Пры разьвіцьці сваёй мастацкай творчасьці пісьменьнікі таксама павінны карыстацца марксавым мэтодам матэрыялістычнай дыялектыкі. Гэта аснова асноў усякае творчасьці пролетарскага пісьменьніка.

З гэтай прычыны мы да вас прад'яўляем такія запатрабаваньні. Пісьменьнік-мастак афармляе адпаведныя процэсы цэлай эпохі ў концэнтраваным выглядзе, дае згустак перажываемых дзеяньняў. На гэтых творах мы выхоўваем новае пакаленьне. Таму мы патрабуем, каб творы пролетарскага пісьменьніка былі-б такімі, якія-б вялі наша маладое пакаленьне да пэўнай мэты — да соцыялізму і дапамаглі-б гэтаму новаму пакаленьню больш хутка асмысьліць свае непасрэдныя задачы.

У творах пролетарскіх пісьменьнікаў павінна быць не формальная фіксацыя адбываючыхся процэсаў, а гэтыя творы павінны быць насычаны адпаведнай мэтаімкнёнасьцю. Трэба ведаць, што калі сам пісьменьнік не асмысьліць адбываючыхся процэсаў як належыць, няправільна іх ацэніць і не заўважыць асноўнага, то на яго творах ня будзе выхоўвацца новае пакаленьне нават і тады, калі твор пісьменьніка будзе высокай мастацкай каштоўнасьці. Гаварыць аб тым, як гэта некаторыя спрабавалі, што задача пісьменьніка заключаецца ў тым, каб даць толькі мастацкую форму без усякай ідэі і даць надклясавы твор — гэта значыць, па меншай меры завуаліраваць свае захаваныя ідэі, якія ідуць у процілегласьці з ідэямі пролетарыяту. Надклясавай літаратуры ва ўсёй гісторыі ня было і няма, як ня было і няма надклясавых пісьменьнікаў - мастакоў.

Такім чынам, мы патрабуем ад пролетарскіх пісьменьнікаў і ад нашых спадарожнікаў, каб у іх творах была закладзена пролетарская ідэя, якая-б штурхала масы наперад да пэўнай мэтаімкнёнасьці — гэта значыць, ліквідацыі клясаў, да перамогі пролетарыяту ў пабудове соцыялізму і організацыі бясклясавага грамадзтва.

Калі можна дасягнуць таго, што пісьменьніцкія творы будуць такімі, якія патрэбны для пролетарыяту, для выхаваньня маладога пакаленьня?

Яны будуць тады, калі пісьменьнік будзе зьяўляцца чалавекам сваёй эпохі, калі ён будзе сапраўды часткай концэнтраванай дзейнай энэргіі гэтай эпохі, калі ён будзе імкнуцца і адлюстроўваць у сваіх творах пэўныя мэты і будзе актыўным удзельнікам соцыялістычнага будаўніцтва.

Мне здаецца, што іменна так трэба падыходзіць усім удзельнікам вашай конфэрэнцыі пры абмеркаваньні і крытыцы тых твораў і літаратурных кірункаў, якія ў вас на конфэрэнцыі абмяркоўваюцца.

Крытыкай паасобных твораў нашых пролетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў заняцца мне ня ўдасца з-за абмежаванасьці часу.

Таму я вам вельмі раю, як мага шырэй разгарнуць пролетарскую крытыку і самакрытыку ўсіх твораў і літаратурных кірункаў. Ня бойцеся крытыкаваць і сваіх уласных недахопаў і недахопаў вашых таварышоў.

Крытыка бязьлітасная, жорсткая, за чыстату марксысцка - ленінскіх прынцыпаў у рабоце пісьменьнікаў нам вельмі неабходна, яна дапаможа кожнаму з вас хутчэй пазбавіцца тых памылак, што яшчэ ёсьць, і па-сапраўднаму аўладаць марксысцка-ленінскай тэорыяй. У той-жа час не абходна захоўваць і тое, каб крытыка была ў вас таварыская, каб яна не заключала ў сабе непатрэбнай грызьні і каб прынцыповую крытыку ня зьвесьці да асабістых разрахункаў.

У нас за апошнія два гады, калі я не памыляюся, не праводзіліся пісьменьніцкія конфэрэнцыі і зьезды, а за гэтыя два гады наша партыя, рабочая кляса, а разам з імі і пролетарскія пісьменьнікі правялі вялізарную работу па ачыстцы ідэолёгічнага фронту ад рознага нацыянал - дэмократычнага шалупіньня. Такім чынам, працуючы зараз на данай конфэрэнцыі, крытыкуючы тую работу і продукцыю, якая дадзена пісьменьніцкімі організацыямі і паасобнымі пісьменьнікамі, вы павінны падвесьці вынікі пройдзенага этапу барацьбы за чыстату ідэолёгічнага фронту.

Наша партыя, мобілізуючы пролетарскую грамадзкасьць, шырокія масы рабочых і працоўнай інтэлігенцыі ў тым ліку і пролетарскіх пісьменьнікаў, атрымала перамогу над клясавым ворагам і на культурным фронце.

Пролетарскія пісьменьнікі ня могуць быць у баку ад гэтай барацьбы за чыстату ідэолёгічнага фронту. Наадварот, пісьменьнікі, як перадавы актыў ідэолёгічнага фронту, павінны быць у першых шэрагах пролетарскай грамадзкасьці ў барацьбе за ідэолёгічны фронт. Многія з вас у гэтай барацьбе прайшлі суровую і сур'ёзную школу за чыстату марксысцка-ленінскай ідэолёгіі, навучыліся многаму, а некаторыя і самі скатваліся туды, куды непатрэбна, потым выпраўляліся, ураўніваліся і пачынаюць ісьці ў нагу з перадавой часткай пролетарскіх пісьменьнікаў.

У выніку гэтай барацьбы мы можам падвесьці на вашай конфэрэнцыі вялізарныя дасягненьні ня толькі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва наогул, але і на фронце ідэолёгічным, у тым ліку і літаратурным.

Калі вы параўнаеце продукцыю пісьменьнікаў, якая выпускаецца зараз, з той продукцыяй, якая выпускалася 3—4 гады таму назад, то ўсякі ўбачыць, што ёсьць вялізарны рост нашай пролетарскай літаратуры і самых пісьменьніцкіх кадраў, як з боку мастацкага, так і з боку ідэолёгічнага.

Многія з пісьменьнікаў выраўнялі сваю ідэолёгію і пачалі правільна разумець лінію партыі і яе політыку ва ўсх галінах соцыялістычнага будаўніцтва. Нам удалося выраўняць ідэолёгічны фронт, ачысьціць яго ад усякага і шалупіньня, лепш організаваць шырокія кадры пролетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў, як і ўсёй інтэлігенцыі, выявіць найбольш устойлівыя і вытрыманыя кадры сярод іх, паставіць іх на кіруючую работу і ў той-жа час дапамагчы тым працаўнікам з інтэлігенцыі, якія імкнуліся сумленна працаваць на карысьць пролетарыяту, але да гэтага часу не разумелі сутнасьці задач партыі і рабочае клясы ў барацьбе на ідэолёгічным фронце.

Нам і надалей трэба дапамагаць такім людзям стаць на правільныя позыцыі.

Ня будзе праўвялічэньнем, калі я скажу, што на конфэрэнцыі МенАПП мы, пролетарскія пісьменьнікі, па сутнасьці адчыняеце новую старонку, новы пэрыод у разьвіцьці пролетарскай беларускай літаратуры.

У зьвязку з гэтым я хачу паставіць такое пытаньне — ці ёсьць у нас матэрыяльная база, каб пашырыць пролетарскую творчасьць і забясьпечыць сваячасовы выпуск продукцыі пролетарскіх пісьменьнікаў?

Такая матэрыяльная база ў нас ужо створана і ўсё далей пашыраецца. Ва ўмовах пролетарскай дыктатуры нам удалося ня толькі падвесьці базу пад работу пролетарскіх пісьменьнікаў, але і пад усё культурнае будаўніцтва. Тут у нас ёсьць вялікія магчымасьці.

Задача пісьменьнікаў заключаецца ў тым, каб скарыстаць гэтыя матэрыяльныя магчымасьці і даваць па-больш продукцыі.

Варта прывесьці наступны прыклад. У Белдзяржвыдавецтве ў 1930 г. выдадзена літаратуры ў разьмеры: па назвах 377, па тыражу 1.480,5 тыс. экз.; у 1931 г. па назвах выдадзена 818 і па тыражу 4.109.000. Такім чынам, мы змаглі і тэхнічна і матэрыяльна забясьпечыць выпуск продукцыі і тым самым узмацніць матэрыяльную базу для рэалізацыі творчасьці пролетарскіх пісьменьнікаў. Як бачыце за адзін год мы падвоілі матэрыяльную базу.

На наступны 1932 г. мы яшчэ больш павялічваем вытворчую базу выдавецтва, што гарантуе яшчэ больш шырокую рэалізацыю творчасьці пісьменьнікаў разам з навуковай і вучэбнай літаратурай. Як бачыце, у нас ёсьць поўная магчымасьць, і тэхнічная і матэрыяльная, пашырыць справу друкаваньня мастацкай літаратуры.

Таму я кажу, што астаноўка не за тэхнічнай і матэрыяльнай базай, а, бадай, астаноўка за творамі нашых пісьменьнікаў. (**Некрашэвіч:** Друкаваць мы спраўляемся).

Я паказаў колькасьць назваў выдадзенай літаратуры, але ня ў крыўду будзе вам сказана, значная колькасьць гэтых назваў зьяўляецца перакладной літаратурай, а ня творчасьцю нашых пісьменьнікаў.

(**Александровіч:** Процантаў 80).

Можа тав. Некрашэвіч скажа, колькі процантаў. Александровіч сказаў 80.

(**Некрашэвіч:** Трохі менш, але каля гэтага).

Выдаваць перакладную літаратуру мы павінны і будзем. Гэта ня дрэнна, а, наадварот, патрэбна нам. Калі па зьместу той ці іншы мастацкі твор адпавядае нашым запатрабаваньням і адбівае рэволюцыйную барацьбу пролетарыяту за соцыялізм, то незалежна ад таго, якой нацыянальнасьці пісьменьнік напісаў тую ці іншую кніжку, мы яе будзем выдаваць, пераклаўшы на зразумелую для данай нацыянальнасьці мову. У той-жа час мы патрабуем, каб і нашы пісьменьнікі больш актывізаваліся і давалі-б болей продукцыі мастацкай літаратуры, каб наша Дзяржаўнае Выдавецтва было загружана творамі нашых пісьменьнікаў ня менш на 50 — 60 процантаў, г. зн. той літаратурай, якая грунтуецца на матэрыяле рэволюцыйнай барацьбы рабочых і сялян БССР.

Паўтараю, што гэта ні ў якім разе не выключае, а, наадварот, прадугледжвае пераклад літаратуры пісьменьнікаў іншых нацыянальнасьцяй, асабліва той літаратуры, матэрыялам для якой зьявіліся буйныя пролетарскія цэнтры альбо рэволюцыйная барацьба пролетарыяту буйнейшых цэнтраў СССР.

Прыклад, гэта я вам прывёў для таго, каб паказаць, што мы ў БССР відавочна адстаем у разьвіцьці пролетарскай літаратуры ад іншых савецкіх нацыянальных рэспублік.

Вы мне можаце сказаць, што добра табе размаўляць пра гэта, а паспрабуй сам што-небудзь напісаць (сьмех). Усё гэта верна. Я, зразумела, не бяруся за выкананьне прамфінпляну па мастацкай літаратуры. У мяне штосьці ня выходзіць у гэтай галіне, але ўсёткі я хачу ад вас патрабаваць, каб вы выконвалі свой пісьменьніцкі прамфінплян так, як мы яго выконваем на фабрыках, заводах, у саўгасах і колгасах.

(**Голас:** Правільна).

Мы ад рабочых патрабуем выкананьня прамфінпляну. Распрацоўваем контрольныя лічбы для кожнай фабрыкі і заводу, а рабочыя гэтыя лічбы ажыцьцяўляюць, ужываючы новыя соцыялістычныя мэтоды працы.

Мне думаецца, што і вам варта распрацаваць нешта накшталт контрольных лічбаў. Можа гэта цяжка зрабіць для пісьменьніка, але ўсё-ж такі я лічу неабходным пра гэта вам напомніць.

Мы павінны высунуць такое патрабаваньне да ўсіх пролетарскіх пісьменьнікаў, бо вы павінны ведаць, што пры агульных вялікіх дасягненьнях на фронце літаратуры ўсё-ж такі пролетарская літаратура зараз адстае ад высокіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, а яна не павінна адставаць.

Дык калі такое патрабаваньне высунута ў артыкуле т. Мэхліса, надрукаваным у «Праўдзе», у адносінах да ўсіх пролетарскіх пісьменьнікаў Саюзу, дык яно тычыцца і пролетарскіх пісьменьнікаў БССР. З гэтага трэба зрабіць вам неабходныя вынікі і павялічыць сваю актыўную творчасьці ў некалькі разоў.

Апошняя мая заўвага будзе заключацца ў тым, што выкананьне пісьменьніцкага прамфінпляну па мастацкай літаратуры залежыць ня толькі ад дзейнасьці самога пісьменьніка, а яно залежыць у значнай ступені і ад работы пісьменьніцкіх аб'яднаньняў. Мы ня можам у сучасны пэрыод організаваных пролетарскіх дзеяньняў на фронце соцыялістычнай будоўлі не прад'яўляць адпаведных патрабаваньняў і да пісьменьніцкіх організацый. Пісьменьніцкія організацыі павінны адыгрываць вялікую організуючую ролю ў справе організацыі творчасьці пісьменьнікаў, у справе дапамогі ім па рабоце над апрацоўкай матэрыялаў, па адшліфаваньні ідэолёгічнай часткі работы. Абавязак пісьменьніцкіх організацый дапамагчы паасобным пісьменьнікам свайго аб'яднаньня.

Акрамя таго трэба дапамагчы і тым пісьменьнікам, якія яшчэ ня зусім сталі на пазіцыі пролетарскіх пісьменьнікаў і зьяўляюцца, як кажуць, нацыімі спадарожнікамі.

Задача пісьменьніцкіх пролетарскіх організацый заключаецца ў тым, каб ператварыць спадарожніка ў пролетарскага пісьменьніка. Такі лёзунг трэба высунуць і ажыцьцявіць на практыцы.

Для таго, каб організацыі пролетарскіх пісьменьнікаў выканалі сваю задачу, у даным выпадку, я маю на ўвазе МенАПП, трэба перабудаваць работу пісьменьніцкіх організацый, улічваючы тое, што мы ўвашлі ў новы пэрыод соцыялістычнага будаўніцтва, што перад усім пролетарыятам, ў тым ліку і перад пролетарскімі пісьменьнікамі, па-новаму сталі задачы соцыялістычнага будаўніцтва.

Пры перабудове работы па-новаму трэба выходзіць з таго, што галоўнай задачай сучаснага пэрыоду зьяўляецца задача ўмець конкрэтна працаваць на фронце соцыялістычнай будоўлі.

Зараз галоўным элемэнтам, які рухае пролетарскую рэволюцыю наперад, зьяўляецца ўменьне практычна па-бальшавіцку працаваць на гаспадарчым фронце і дасягнуць неабходных посьпехаў.

Мы зараз ацэньваем усіх нашых працаўнікоў не па тым, як ён піша рэзолюцыі і якія робіць прамовы, а па тым, як ён на справе ажыцьцяўляе бальшавіцкія тэмпы ў гаспадарчай рабоце. Умееш выконваць даручаную работу і спраўляцца з выкананьнем пляну, значыць, добры рэволюцыянэр - бальшавік, значыць, адважны і сьмелы, а калі ня ўмееш працаваць і ў рабоце маюцца прарывы, то нікуды ты няварты.

На даным этапе галоўным зьвяном прасоўваньня соцыялістычнай рэволюцыі наперад зьяўляецца фронт соцыялістычнай будоўлі. Тут можна прывесьці некаторую аналёгію з пэрыодам грамадзянскай вайны.

У час грамадзянскай вайны, калі мы прызначалі таго ці іншага камандзіра на баявы вучастак фронту, то давалі яму адпаведныя даручэньні ня толькі адстаяць позіцыі пролетарскага фронту, але і прасунуцца наперад. І Калі ён, выконваў наша даручэньне, то, значыць, ён быў добрым бальшавіком і баявым командзірам, а калі ён ня выконваў загаду партыі, то яго мянялі як нягоднага командзіра.

Зараз вы знаходзімся ў такім пэрыодзе, калі фронт гаспадарчы зьяўляецца вырашальным фронтам нашай пролетарскай рэволюцыі.

Посьпехі на гаспадарчым фронце адначасова ўзмацоўваюць і нашу абароназдольнасьць, тэхнічна і матэрыяльна ўзмацоўваюць баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі.

Таксама і да пісьменьнікаў я прад'яўляю адпаведныя запатрабаваньні ў іх рабоце на ідэолёгічным фронце і на фронце пролетарскай мастацкай літаратуры.

Даеш добрую мастацкую продукцыю — значыць, добры бальшавіцкі пісьменьнік, а не даеш, толькі гаворыш і мала пішаш — значыць, пісьменьнік ня зусім добры.

Для таго, каб пісьменьнікі маглі перабудаваць свае шэрагі, улічваючы галоўныя задачы на даным этапе, трэба самім пісьменьніцкім організацыям перабудаваць сваю работу, прыстасоўваючы яе да новых задач. Самае галоўнае ў тым, каб організацыі пролетарскіх пісьменьнікаў знайшлі конкрэтныя формы перабудовы сваёй работы.

Вось гэта асноўныя мае пажаданьні.

У заключэньне дазвольце выказаць надзею, што тыя задачы, якія партыя пастаўлены перад пролетарскімі пісьменьнікамі, і якія практычна будуць конкрэтызаваны ў пастановах вашай конфэрэнцыі, вы, шляхам усё большай актывізацыі сваіх шэрагаў, пад кіраўніцтвам нашай партыі і яе правадыра тав. Сталіна выканаеце на ўсе сто процантаў. (Доўгія воплескі).

ЗРОБІМ МАСТАЦТВА сапраўднай зброяй пролетарыяту

Творчую дыскусію--на ўвесь фронт мастацтва

Карэнна перабудаваць работу РОМБ'у

Выяўленчае мастацтва БССР зьяўляецца да гэтага часу адным з адстаючых вучасткаў на фронце нашага культурнага будаўніцтва. Гэтае становішча абавязвае організацыю мастакоў Беларусі РОМБ разгарнуць шэраг дыскусій, выступленьняў у друку, мобілізаваць грамадзкую думку вакол пытаньняў выяўленчага мастацтва. Аднак у практычнай дзейнасьці РОМБ'а пануе цішыня і застой.

У БССР, дзе кадры мастакоў малалікія, на організацыю РОМБ ускладаюцца вялізарнейшыя задачы па стварэньню продукцыі, якая-б адлюстравала соцыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне. РОМБ павінен сконцэнтраваць увагу на выхаваньні кадраў з рабочых - ударнікаў, якія працуюць у галіне самадзейнага мастацтва.

РОМБ ня толькі ня змог організацыйна ахапіць блізкіх да нас спадарожнікаў, але і ня змог як належыць разгарнуць работу ў сваіх філіях (Гомель, Віцебск), аб чым сьведчыць IV Усебеларуская выстаўка, дзе акрамя продукцыі мастакоў Менску і некалькіх плякатаў мастацкага тэхнікуму ніхто з іншагародных мастакоў ня ўдзельнічаў.

Самую працу вакол выстаўкі трэба прызнаць зусім нездавальняючай, формальнай. Ні абгавэрэньняў, ні дыскусіі вакол выстаўкі з шырокім удзелам пролетарскай грамадзкасьці ня было праведзена. РОМБ абмежаваўся адкырцьцём выстаўкі, лічачы сваю місію выкананай. У выніку мы мелі зусім малую колькасьць наведвальнікаў выстаўкі. Акрамя невялікага дыспуту з удзелам мастакоў і пісьменьнікаў больш нічога не праводзілася.

РОМБ нічога не зрабіў, каб стварыць перасоўную выстаўку ў рабочыя клюбы і найбольш буйныя калгасы.

Політычна - выхаваўчая праца сярод мастакоў у заняпадзе: за ўвесь год ня было праведзена ніякай творчай дыскусіі, ніводнай лекцыі па пытаньнях мастацтва. Тыя пытаньні, якія з усёй вастрынёй абгаворваюцца ў РАПХ у сувязі з апошнім лістом тав. Сталіна, у сувязі з абвостранай барацьбой на ідэолёгічным фронце, не знаходзяць месца ў штодзеннай рабоце РОМБ'у, работа якога характарызуецца політычнай бяззубасьцю і інэртнасьцю. Крытыка і самакрытыка яшчэ ня стала мэтодам штодзённай работы ў організацыі.

Выстаўка, якая павінна быць організавана да XV гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, павінна стаць экзаменам для мастакоў БССР і ў першую чаргу для РОМБ'у.

Трэба, каб на гэтай выстаўцы акрамя мастакоў - профэсіяналаў былі прадстаўлены пачаткоўцы і ізорамаўцы. Для гэтага трэба правесьці вялікую падрыхтоўчую работу.

Каб даць магчымасьць мастакам стварыць палотны, якія-б адлюстравалі соцыялістычнае будаўніцтва нашай краіны, неабходна організаваць мэтавыя камандыроўкі мастакоў у буйныя індустрыяльныя і калгасныя цэнтры. Трэба, каб ВСНГ, Колгасцэнтр, Гарпрофсавет і інш. з усёй сур'ёзнасьцю аднесьліся да гэтага пытаньня. Вылучаная комісія культмасавым аддзелам ЦК павінна ў бліжэйшы тэрмін рэалізаваць пастаўленыя перад ёю задачы.

Толькі пры карэннай перабудове працы РОМБ'у, пры належнай дапамозе ў яго працы з боку грамадзкіх організацый, мы зможам падняць выяўленчае мастацтва на ўзровень запатрабаваньняў соцыялістычнага будаўніцтва.

А. Забораў.

Мастацкі тэхнікум на ўзровень перадавых задач эпохі

Віцебскі мастацкі тэхнікум адзін у БССР, які рыхтуе працаўнікоў мастацтва—кадры мастакоў—графікаў (поліграфія), для выдавецтваў, падагогаў маляваньня, клюбных інструктароў.

За апошнія два гады тэхнікум сапраўды па-бальшавіцку пачаў перабудову сваёй вучобы і працы. Тыя старыя варожыя нам мэтоды выхаваньня маладога мастака, якія выхоўвалі рэзкі індывідуалізм—мастака-адзіночкі, людзей з марамі выдзяліцца з асяродзьдзя,—усё гэта спрыяла расквіту богемных настрояў, якія вельмі часта спалучалася з адчыненай варожай ідэолёгіяй, шжо ішла ад засьмечанасьці тэхнікума—сынкамі папоў, генэралаў і інш. Дзейнасьць і праца ў мастацкай галіне была адорвана ад будаўніцтва соцыялізму, ад вытворчасьці сучасная тэматыка распрацоўвалася прыстасавэнскі. Панавала абстрактнасьць, «композыцыі на вольную тэму». Многія з маладых мастакоў захапляліся юдовінскім старым нацыянальным мястэчкам, значна адчуваўся ідэёвы ўплыў нацыянал - дэмократызму, захапленьне самабытнасьцю, усхваленьне архаічнага «лапцюжнага селяніна».

Гэтак было амаль да 1928 г., кіраўніцтва тэхнікуму было варожым нам. Ячэйка КСМ у той час складалася з адзінак. Партыйнае ядро было дужа слабым.

Партыйныя організацыі і Галоўмастацтва зьвярнулі ўвагу на мастацкі тэхнікум. Зьмянілася кіраўніцтва. Новаму партыйнаму кіраўніцтву, давялося зрабіць цэлую рэволюцыю ў тэхнікуме, зламаць старыя традыцыі. Партыйнае ядро значна ўзмацнілася, камсамольская ячэйка больш поўна разгарнула сваю працу. Але гэта быў цяжкі шлях змаганьня за новыя пагляды на мастацтва, за станаўленьне на рэйкі сапраўднага пролетарскага мастацтва. Былі створаны колектыўныя групы, брыгады, якія на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва выконвалі свае заданьні па мастацтву. З гэтага часу тэхнікум разгарнуў работу па адлюстраваньні ўздыму соцыялістычнага будаўніцтва, гэтае адлюстраваньне соцыялістычнага будаўніцтва было конкрэтызавана, кожная брыгада, кожны студэнт, кожны курс зьвязаўся з вытворчасьцю. На абутковай фабрыцы Лекерта, дзе быў прарыў, прымацавалася брыгада маладых мастакоў, якая плякатамі, малюнкамі змагалася за якасьць. Студэнты пачалі падрабязна вывучаць прадпрыемствы, прысутнічаць на вытворчых нарадах, наведваць цэхі, адшукваць прычыны прарываў, браку, і пасьля ўжо пераходзілі сіламі мастацкай зброі да ліквідацыі гэтых непаладкаў на вытворчасьці. У працэсе працы эскізы абгаварваліся рабочымі, якія ўносілі ў мастацкія творы шэраг надзвычайна цікавых папраўак, што да способу выражэньня, у плякаце, у малюнку станоўшча вытворчасьці, заводу. Выяўленчым мастацтвам студэнты тэхнікуму на абутковай фабрыцы змагаліся з прагульнікамі, бракам: організоўвалі ганебныя слупы ў цэхах, могілкі прагульнікаў, плякаты, лёзунгі, карыкатуры і інш.

У адпаведнасьці з новымі задачамі, якія пастаўлены перад тэхнікумам, пачалася перабудова і ўсіх програм работы, і вучобы.

У. Сокалаў.

Першая конфэрэнцыя кіно-гледачоў


У Бабруйску 3-га красавіка адбылася першая конфэрэнцыя кіно-глядачоў. Па дакладу прадстаўніка Белдзяржкіно разгарнуліся шырокія спрэчкі. Конфэрэнцыя зазначыла на вялікую работу, праведзеную БДК у галіне кінофікацыі гораду і раёнаў (павялічэньне колькасьці кіно-перасовак, стацыянарных установак па клюбах і сельсаветах, пабудова да 15-й гадавіны Кастрычніка гукавога кінотэатру ў Бабруйску), павялічэньне процанту прагляду кіно-фільмаў рабочым глядачом і працоўным насельніцтвам наогул. Аднак конфэрэнцыя паказала на нездавальняючую выхаваўчую работу. Камэрцыйныя мэты часта засланялі ўсе іншыя мэты ў грэсьце БДК. Замежная буржуазная халтура з удзелам Дуглас Фэрбэнксаў, Гарольд Лёйдаў знаходзіла шырокую рэкляму, у той час, як лепшыя савецкія вытворчыя фільмы («Чалавек застаўся адзін», «Висёлае жыцьцё», «Суд павінен працягвацца») праходзілі незаўважанымі. У мясцовым друку (газ. Комуніст») у 1931-32 г. ня было зьмешчана аб кіно ніводнай заметкі. Дрэнна абстаіць справа ў клюбах. Загадчыкі клюбаў, адбіваючы патрабаваньні сваіх аўдыторый, патрабуюць «бліскучых замежных фільмаў», якія ў сваёй абсолютнай большасьці пад зьнешняй бліскучасьцю хаваюць нутраную пустату, бязьзьместоўнасьць. На гэтых фільмах можна было-б паказаць глядачу выміраньне буржуазнага мастацтва. Аднак, як для двух бабруйскіх кінотэатраў («Асьвета», «Пролетары») так і для шэрагу клюбаў ня існуе дыспутаў аб тым ці іншым фільме.

На конфэрэнцыі абраны мастацка-політычны савет кіно, у які ўвайшлі прадстаўнікі рабочых буйнейшых бабруйскіх прадпрыемстваў.

Савет бясспрэчна адыграе—як паказаў прыклад стварэньня мастацка-політычнага савету пры тэатры, вялізэзную політычную ролю ў справе выхаваньня рабочага глядача.

Б. Шарупіч.

„Контратака" у тэатры ЦСПСБ



Зьмітрок Астапенка

Абураныя

Над вуліцамі гарадоў
Плылі іх песьні гнеўнай стромай...
Ішлі спагнаць свой даўні доўг
Краіны біржаў і астрогаў.
Той дзень трывожны бурна ўстаў
У яркіх фарбах абурэньня...
З іх кожны ўзьняў пахілы стан
На фабрыках, у сутарэньнях.
Гуташыў вуліцы іх рытм
Магутных крокаў... беглі людзі.
І на вітрыны гандляры
Спускалі моцныя жалюзі.
На іх глядзелі злосьць і страх
І здрада з кожнай падваротні.
Іх вораг з зброяю ў руках
Чакаў на кожным павароце.
Ў той дзень у гнеўным моры сёл
Двары асаднікаў гарэлі.
І партызанскі шум лясоў
Трывожылі глухія стрэлы.
Той дзень, як сонца узышло,—
Імчаў угрунь нястрымным бегам,
Ў той дзень сяляне за сяло
Вялі да шыбеніцы шпэга.

Над фабрыкамі ня вісеў
Штодзенны дым. Яны на плошчы
Абураныя выйшлі ўсе,
Каб гневу разьлягаўся пошчак.
Яны ішлі рука ў руку...
Над імі кроў сьцягоў гарэла
І вось у здрадным тупіку
Ударылі раптоўна стрэлы.
Там стогнаў, целаў кругаверць,
Там бег уздыбіўся адразу...
Ім кулі здрадца несьлі сьмерць,
Ім вочы разьядалі газы.
Разьбітыя... ішлі яны
І адбіваліся ў запале...
І дзеўчынка каля сьцяны
На бруднай вуліцы упала.
...Увечары маўчаў тупік:
Да моргу трупы везьлі ўпрыцём.
І сьцены 'шчэ хавалі крык:
«—Мы прыдзем зноў!..
—Мы хутка прыдзем!».

24-1—32 г.

За мастацтва, вартае вялікае эпохі

(З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве БССР)

7. У галіне разьвіцьця мастацтва

Пленум ЦК і ЦКК адзначае значныя дасягненьні ў галіне разгортваньня мастацтва ў БССР: мастацкая літаратура, тэатр, кіно, выяўленчае мастацтва, музыка і г. д., некаторае, праўда зусім яшчэ невыстарчальнае набліжэньне мастцтва, у асаблівасьці, мастацкай літаратуры, тэатру да задач соцыялістычнага будаўніцтва, а таксама ўзрослы ўдзел шырокіх працоўных мас у будаўніцтве пролетарскага мастацтва БССР, атрымаўшы сваё выяўленьне як у закліку ўдарнікаў - рабочых і колгасьнікаў у літаратуру, так і ў тэй вялізарнай узрастаючай зацікаўленасьці шырокіх працоўных мас да беларускай літаратуры, тэатру і г. д.

Адначасова пленум катэгарычна падкрэсьлівае, што тэмпы перабудовы работы ў галіне мастацтва адстаюць яшчэ ад запатрабаваньня цяперашняга этапу соцыялістычнага будаўніцтва.

Выходзячы з гэтага пленум ЦК у далейшым лічыць неабходным:

а) Сконцэнтраваць увагу ўсёй КП(б)Б на задачах барацьбы з клясава - варожымі тэорыямі і вылазкамі на фронце мастацтва, накіроўваючы агонь супроць правага і «левага» опортунізму, дабіцца большага набліжэньня мастацтва і літаратуры да актуальных задач соцыялістычнага будаўніцтва.

б) Разгарнуць сетку мастацкіх, тэатральных, эстрадных, музычных адзінак з такім разьлікам, каб да канца другой пяцігодкі было ня менш аднэй адзінкі на два адміністрацыйныя раёны.

в) Забясьпечыць адкрыцьцё ў 1933 годзе тэатру музычнай драмы, а таксама вышэйшай музычнай школы.

г) Забясьпечыць адкрыцьцё на працягу двух год ня менш як аднаго стацыянарнага кіно ў кожным раёне.

д) Пачаць у гэтым годзе будаўніцтва кінофабрыкі з такім разьлікам, каб скончыць яе на працягу двух бліжэйшых год.

е) Забясьпечыць будаўніцтва ў Менску тэатральнага будынку са скончэньнем пабудовы не пазьней першай паловы 1934 г.

ж) Андэй з першачарговых задач у літаратурным руху паставіць ажыўленьне работы ўсіх організацый, у прыватнасьці БелЛАЧАФ і пролетарска - колгасных пісьменьнікаў.

Пленум указвае на неабходнасьць узмацненьня барацьбы супроць клясава - варожых плыняў у літаратуры, мобілізуючы пісьменьнікаў на аўладаньне марксыцкім сьветапоглядам, на набліжэньне да рабочай клясы спадарожнікаў і саюзьнікаў, на стварэньне магнітабудаў літаратуры, за вялікае мастацтва бальшавізму. Пленум падкрэсьлівае, што неабходнай умовай выкананьня задач партыі ў галіне мастацтва, у асаблівасьці ў галіне літаратуры — зьяўляецца разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі ў мастацкіх організацыях.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК указвае ,што далейшае пасьпяховае разьвіцьцё беларускай культуры, мастацтва і літаратуры патрабуе шырокага выкарыстаньня і крытычнай пераапрацоўкі будуючайся беларускай соцыялістычнай культурай усіх каштоўнасьцяй сусьветнай культуры, рашучага разрыву з перажыткамі провінцыяльнай абмежаванасьці, цеснага і брацкага супрацоўніцтва з працоўнымі масамі ўсіх нацыянальнасьцяй СССР, стварэньня новых культурных каштоўнасьцяй, вартых нашай вялікай эпохі, вартых творчасьці вялікай клясы пролетарыяту.

Ільля Гурскі

Тэатральная дыскусія--стымул шпаркага росту і поступу

(З дакладу на 1-й Усебеларускай нарадзе дырэктароў тэатраў БССР і старшынь МК з удзелам мастацкіх кіраўнікоў тэатральных прадпрыемстваў гор. Менску)

Вялікі Кастрычнік, вызваліўшы народы СССР ад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня, даў неабмежаваныя магчымасьці для разьвіцьця экономікі, культуры—літаратуры, мастацтва і навукі. Да Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі было 70 проц. няпісьменных, у 1930—31 г. зроблены пачатак увядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня за сямігадовую школу. На Беларусі да Кастрычніцкай рэволюцыі ня было ніводнай вышэйшай навучальнай ўстановы, цяпер у БССР 26 вышэйшых навучальных установ і 65 тэхнікумаў, у якіх навучаецца больш за 20 тысяч чалавек. Разгорнута сетка навукова-дасьледчых інстытутаў, у якіх падрыхтоўваюцца высока - кваліфікаваны спэцыялісты для нашай прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва. Выдаткі на культурнае будаўніцтва з кожным годам павялічваюцца. У гэтым годзе на культурнае будаўніцтва ідзе 30 проц. агульнага бюджэту. Узрастае павялічэньне асыгнаваньняў і на мастацтва. Адносная вага сродкаў на мастацтва па агульным бюджэце на народную асьвету 1931 г. складала 4,5 проц., а ў 1932 г.—5,9 проц.

За гэты час створан цэлы шэраг дзяржаўных тэатраў. Значна палепшыўся соцыяльны і партыйны склад працаўнікоў тэатральнага мастацтва. Палепшаньне соцыяльнага складу, галоўным чынам, было за лік рабочай моладзі,—узрасла праслойка комсамольцаў. Трэба ў далейшым з яшчэ большай сілай праводзіць арабачэньне, што дасьць павялічэньне партыйнага складу працаўнікоў тэатральнага мастацтва. Мне думаецца, што неабходна па прыкладу літаратуры правесьці заклік рабочых—ударнікаў у тэатральнае мастацтва.

У БССР за апошнія гады шырока разгарнулася самадзейнае мастацтва. Налічваецца каля 900 мастацкіх гурткоў, у якіх удзельнічае 20 тысяч чалавек. Праўда, трэба сказаць, што мы, галоўмастацтва НКА, а таксама Культсэктар ЦСПСБ, ЦП Працмастацтва, ЛКСМБ і іншыя організацыі, амаль ня кіруем гэтым сапраўды масавым мастацкім рухам. Тое, што мы робім, гэта кропля ў моры. Задаволіць нас гэта ніяк ня можа. Патрэбна праз газэту «Літаратура і Мастацтва», а таксама праз мастацкую часопісь, якая мяркуецца выдавацца ў гэтым годзе, узмацніць кіраўніцтва фронтам самадзейнага мастацтва.

У БССР шырока разгарнуўся трамаўскі рух, вышэйшая форма самадзейнага мастацтва. Трамаўскі рух—пролетарскі рух. ТРАМ разам з БелАПП'ам павінен адыграць вырашальную ролю ў справе соцыялістычнай рэконструкцыі савецкага мастацтва БССР. На сёнешні дзень налічваецца 6 ТРАМ'аў, аднаму з якіх колегіяй НКА надана годнасьць «Беларускага Дзяржаўнага Тэатру Рабочай Моладзі».

У галіне падрыхтоўкі пролетарскіх тэатральных кадраў мінулым нацыянал - опортуністычным кіраўніцтвам НКА нічога ня зроблена. Толькі ў 1931 г. організаваны ў Менску тэхнікум сцэнічнага мастацтва і крыху раней, у 1930 г., аднагадовыя драматычныя курсы. Работа гэтых установ яшчэ і да гэтага часу не пастаўлена як сьлед.

Кажучы аб разьвіцьці тэатральнага мастацтва ў БССР, мы ўсё-ж павінны адзначыць, што, ня гледзячы на вялізарнейшы размах тэатральнай справы, сёньня тэатры БССР ні ў якай меры ня могуць задаволіць таго ўзрослага запатрабаваньня з боку працоўных, мас якія значна вырасьлі за гады рэволюцыі культурна.

Беларускі контррэволюцыйны нацыянал - дэмократызм орыентаваў разьвіцьцё беларускага тэатру па шляху стварэньня буржуазнага тэатральнага мастацтва. Беларускія контррэволюцыйныя нац-дэмократы тармазілі разьвіцьцё тэатральнага мастацтва, тармазілі падрыхтоўку пролетарскіх кадраў для яго. Партнарада, што адбывалася пры Культпропе ЦК КП(б)Б, разглядаючы пытаньні пляніваньня мастацтва БССР, вызначыла давесьці да канца другой пяцігодкі колькасьць тэатраў з такім разьлікам, каб адзін тэатр прыпадаў на два раёны. У адпаведнасьці з гэтым вызначылася разгортваньне навучальных мастацкіх установ для падрыхтоўкі пролетарскіх кадраў.

Калі прасачыць, праналізаваць разьвіцьцё тэатральнага мастацтва БССР, дык мы пераканаемся, што ўся тая абвостраная клясавая барацьба, якая адбывалася і адбываецца ў краіне, знаходзіла і знаходзіць сваё праяўленьне і на фронце тэатральнага мастацтва.

Вялікадзяржаўныя шовіністы імкнуліся давесьці немагчымасьць існаваньня беларускага савецкага тэатру, разглядалі беларускі тэатр, як «расійскі тэатр на беларускім нарэччы», як тэатр «няздольны стварыць мастацкія каштоўнасьці», адначасна з гэтым, стыкаючыся з беларускімі контррэволюцыйнымі нацыянал - дэмократамі, імкнуліся накіраваць разьвіцьцё беларускага тэатру па шляху стварэньня буржуазнага мастацтва. Мы мелі таксама разгаворчыкі вялікадзяржаўных шовіністаў пра тое, што організацыя БДТ3, гэта «дарэмная трата грошай», што гэты тэатр ніколі ня здолее вырасьці ў мастацкую адзінку. Такія-ж разгаворчыкі былі калісьці і пры організацыі БДТІ. Першая пастаноўка БДТ3 «Энтузіясты» паказала, што колектыў тэатру мае ўсе магчымасьці для свайго ідэёва-мастацкага росту.

Калі мы возьмем Беларускі Дзяржаўны Першы Тэатр, дык доказам таго, што вялікадзяржаўныя шовіністы разам з нацыянал-дэмократамі намагаліся выкарыстаць мастацтва супроць дыктатуры пролетарыяту, зьяўляюцца такія пастаноўкі, як прыкладам «Вір»—Рамановіча. Зьмест гэтай п'есы накіраваны ў бок рэстаўрацыі сярэднявечча і ўяўляе сабой спробу ідэалізацыі фэўдалізму, паказанага ў дэкаратыўна - романтычным асьвятленьні. Адсюль вонкавая пышнасьць, фальш гэтага па сутнасьці псэўда-гістарычнага спэктаклю. Альбо «Тутэйшыя» Янкі Купалы—п'еса накіравана сваім гастрыём супроць савецкай улады, наскрозь прасякнута буржуазнай ідэалёгіяй. Ці возьмем п'есу Грамыкі «Скарына, сын з Полацку»—махровы нацыяналістычны твор, што ідэалізуе Скарыну з яго «самабытнымі» атрыбутамі ды шмат іншых п'ес: «Эльга» Гауптмана, «Змрок» Шашалевіча, «Кастусь Каліноўскі» і г. д., што паказваюць, у які бок рэакцыйнае кіраўніцтва тэатру і тагочаснае нацыянал-опортуністычнае кіраўніцтва НКА накіроўвалі разьвіцьцё маладога беларускага тэатру.

Другі Белдзяржтэатр на першым этапе свайго разьвіцьця, таксама як і БДТ1, апынуўся ў палоне беларускіх контррэволюцыйных нацдэмократаў, якія разам з вялікадзяржаўнікамі з МХАТ2 (Смышляеў, Афонін ды інш.) імкнуліся накіраваць тэатр на служэньне «чыстаму, узвышанаму, надклясаваму мастацтву», імкнуліся адарваць тэатр ад героікі соцыялістычнага будаўніцтва. Малады акторскі колектыў, захапіўшыся ідэямі нацыяналістычнай буржуазнай культуры, аддаў шмат год на служэньне нацыянал-фашысцкім апологэтам кулацтва, беларускім нацыянал-дэмократам. Доказам гэтага зьяўляюцца такія пастаноўкі, як «Апраметная» Шашалевіча—спэктакль, наскрозь прасякнуты нацдэмаўскай ідэолёгіяй, «Бакханкі» Эўрыпіда—асноўная ідэя якой зводзіцца да немагчымасьці барацьбы чалавека супроць бога, «Эрос і Псыхея» Жулаўскага—сымболіка гэтай п'есы: усё матэрыяльнае прыводзіць да гібелі і толькі душа, вызваленая ад усяго земнага, можа выратаваць увесь сьвет, шмат іншых п'ес паказваюць, як беларускія контррэволюцыйныя нацдэмократы (Ляжневіч, Красінскі ды інш.) разам з вялікадзяржаўнымі шовіністамі з МХАТ2 (Смышляеў, Афонін ды інш.) імкнуліся скарыстаць і скарыстоўвалі тэатр як зброю супроць нас.

У разьвіцьці Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру БССР, ня гледзячы на больш менш моцны соцыяльны склад яго, першы пэрыод характарызуецца нацыяналістычнай абмежаванасьцю і захапленьнем «узвышаным, бясклясавым, сусьветным», па-сутнасьці буржуазным, мастацтвам. Тэатр, у той час—студыя, знаходзіўся пад моцным уплывам МХАТ'у і Маскоўскага Госэту. У выніку зьяўляюцца такія пастаноўкі як «Сьвята ў Кастрылаўцы» па Шолому-Алэйхему—спэктакль ідэалізуе яўрэйскі местачковы быт у сьвятле добрадушнага дробнабуржуазнага сузіральнага гумору, «На пакаянным ланцугу» Пэрэца—нацыяналістычны спэктакль, характарны замілаваньнем да яўрэйскай нацыянальнай романтыкі і экзотыкі, збэвены глыбокай містыкай, ці «Скапэн»—формалістычны спэктакль, прасякнуты голай эстэтыкай ды інш. Толькі пастаноўку «Хэдэра» мы разглядаем як станоўчае зьявішча,—спэктакль быў выкарыстаны ў барацьбе з яўрэйскім клерыкалізмам.

Беларускі Дзяржаўны Вандроўны Тэатр рос і разьвіваўся ў крышку іншых умовах. Гэты тэатр на працягу 10 год працаваў галоўным чынам у вёсцы і прарабіў даволі значную работу. Асноўная заслуга тэатру—яго гнуткасьць. Тэатр наведваў самыя далёкія «мядзьвежыя» куткі БССР. У гэтым тэатры на працягу першага этапу яго разьвіцьця працавала амаль уся сям'я Галубка. Галубок быў у ім і рэжысэрам, і драматургам, і мастаком, і рэквізытарам і нават бухгальтарам. У гэтым тэатры амль што да 1928 г. ставіўся рэпэртуар, напісаны выключна самім Галубком «Ганка», «Плытагоны», «Пінская мадона», «Пан Сурынта» ды шмат і ниш). Соцыяльная вартасьць і мастацкая якасьць пераважнай большасьці гэтых пастановак—вельмі нізкая. Гэта п'есы—у сваёй большасьці мэлёдрамы з ненатуральнай інтрыгай, заўсёды падкрэсьлены трагічным канцом. Некаторыя з п'ес бытавога характару, напісаны Галубком яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы, зразумела не маглі мібілізоўваць працоўнае сялянства на барацьбу за соцыялістычную перабудову вёскі.

Паварот тэатру БССР адбыўся пасьля тэатральнай дыскусіі ў 1928 г., якая фактычна закранула ўсе галіны мастацтва. Набліжэньне тэатру БССР да выкананьня задач, пастаўленых партыяй у галіне мастацтва, з году ў год, асабліва на працягу апошняга часу, разгортваецца з нарастаючай сілай.

Сучасны этап у галіне разьвіцьця тэамастацтва БССР характарызуецца наступным:

Значная частка працаўнікоў тэафронту, якая ў свой час была пад уплывам клясава-варожай ідэолёгіі, убачыўшы нашу перамогу ў галіне экономікі, культуры, наблізіліся да нас, жадае працаваць і працуе над стварэньнем тэамастацтва БССР—нацыянальнага па форме і пралетарскага зьместам, імкнецца аўладаць мэтодам дыялектычнага матэрыялізму. Некаторая-ж частка за апошні час актывізуецца і выступае, праўда, больш у завуаляванай форме, супроць перабудовы тэатральнага мастацтва, супроць усіх мерапрыемстваў, праводзімых у галіне культурнага будаўніцтва.

Мацнее пралетарскі сэктар баларускай савецкай драматургіі, расьце зацікаўленасьць тэатральным мастацтвам з боку пролетарскіх, саюзьніцкіх і спадарожніцкіх пісьменьнікаў. Гэтаму спрыяюць захады з боку Галоўмастацтва, як заключэньне ўмоў на напісаньне п'ес, стымуляваньне некаторых тэатраў, паасобных рэжысэраў і дырэктароў тэатраў працаваць над стаўарэньнем орыгінальнага пролетарскага спэктаклю (меліся выпадкі, калі на працягу аднаго-палутара год добрыя пролетарскія п'есы ня прымаліся да пастаноўкі). Усё гэта выклікала актывізацыю з боку беларускіх пролетарскіх і спадарожніцкіх пісьменьнікаў на стварэньне орыгінальнага рэпэртуару. Ужо здавны ў распрацоўку драматургічныя творы Аронэса і Рафальскага, Ільлінскага, Сташэўскага, Колгаса, Гурскага; канчаюць напісаньнем п'есы пісьменьнікі Кобец, Чорны, Барашка, Шашалевіч, Міровіч і інш., пішуць п'есы Чарот, Вольны, Мурашка, Крапіва, Курдзін, Стэльмах, Кляшторны, Зарэцкі, Мікуліч, драмгрупа яўрэйскага ТРАМ'у, група польскіх пісьменьнікаў ды інш.

Барацьба за партыйнасьць у мастацтве, за бальшавіцкую ідэёвасьць, за Магнітабуды мастацтва, за мастацтва—нацыянальнае па форме і пролетарскае зьместам, за высокую мастацкую якасьць продукцыі тэатраў БССР, за ліквідацыю адставаньня тэамастацтва ад задач, пастаўленых партыяй, можа быць пасьпяхова вырашана толькі ў працэсе напружанай работы над выпрацоўкай творчага мэтоду пролетарскага мастацтва, мэтоду дыялектычнага матэрыялізму, і самай цеснай непарыўнай сувязьзю з практыкай соцыялістычнага будаўніцтва. Перад намі стаіць задача, па прыкладзе беларускай пролетарскай літаратуры, разгарнуць шырокую творчую тэатральную дыскусію, якая павінна садзейнічаць ідэёва-творчаму росту, выпрацоўцы творчага мэтоду.

Сёньня мастацтва БССР на новым этапе. Гэта абавязвае кожнага працаўніка мастацтва шчыльней падыйсьці да вывучэньня тэорыі Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, увязваючы гэтае вывучэньне з практыкай удзелу тэомастацтва прыўласнымі яму сродкамі ў выкананьні конкрэтных задач соцбудаўніцтва. Толькі на аснове глыбокага авалоданьня марксыцка-ленінскім сьветапоглядам працаўнікі тэатральнага мастацтва БССР сапраўды здолеюць выпрацаваць пролетарскі творчы мэтод, здолеюць правільна вырашыць задачы, пастаўленыя партыяй перад тэатральным мастацтвам.

Разгортваньне шырокай тэатральнай дыскусіі павінна адбывацца, выходзячы з марксыцка-ленінскіх позыцый, на аснове сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі.

Было-б няверным і памылковым абмяжоўваць разгортваньне тэатральнай дыскусіі ўдзелам толькі працаўнікоў тэатральнага мастацтва. Неабходна прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў дыскусіі БелАПП, пролетарска-колгасных і спадарожніцкіх пісьменьнікаў, Драмтаварыства, РОМБ, усю пролетарскую грамадзкасьць наш бальшавіцкі друк. Неабходна перанесьці разгортваньне шырокай тэатральнай дыскусіі на старонкі газэты «Літаратура і мастацтва».

Трэба павесьці самую рашучую барацьбу супроць меншавіствуючага і мэханістычнага скажэньня марксызму, за матэрыялістычную дыялектыку ў тэорыі практыцы мастацкіх устаноў.

Без найхутчэйшага перамаганьня ўсіх тых памылак, якія ёсьць у рабоце тэатраў БССР, незамацаваўшы ўсяго таго станоўчага, што ёсьць у рабоце тэамастацтва, мы ня здолеем узьняцца на вышэйшы этап у сваім разьвіцьці.

Задачай кожнага тэатру зьўляецца:

праверыць і падагуліць творчы шлях свайго разьвіцьця, сыстэматызаваць свой творчы вопыт, улічыць свае дасягненьні і памылкі, выходзячы з задач, высунутых партыяй перад мастацтвам;

творчая дыскусія тэатраў БССР павінна распачацца з абгаварэньня творчых шляхоў, памылак і дасягненьняў кожнага тэатру, выяўляючы творчы твар, высоўваючы задачы перад кожным рэжысэрам, акторам, драматургам;

творчая дыскусія павінна спрыяць накапленьню і перадачы вопыту барацьбы за пролетарскае мастацтва;

разгортваючы творчую дыскусію, кожны тэатр павінен усьвядоміць сваё месца ў сыстэме савецкага мастацтва, выявіць свае адносіны да трамаўскага руху, да паасобных тэатраў БССР і СССР; праверыць, што зроблена ў сэнсе дапамогі самадзейным мастацкіх гурткам;

выявіць адносіны паасобных актораў і ўсяго тэатру да пастановы сакратарыяту РАПП пра задачы РАПП на тэатральным фронце, загадзя прапрацаваўшы яе ў колектыве тэатру; неабходна на падставе тэатральнага дакуманту РАПП праводзіць консолідацыю працаўнікоў пролетарскага крыла тэафронту;

праверыць, наколькі працаўнікі тэамастацтва зьвязаны з літаратурнымі організацыямі, усьвядоміць неабходнасьць штодзеннай сувязі з пісьменьніцкімі організацыямі і ў першую чаргу з БелАПП, пераносячы станоўчы вопыт БелАПП у клясавай барацьбе на фронце літаратуры ў практыку работы тэамастацтва;

вызначыць правільныя пэрспэктывы свайго далейшага творчага разьвіцьця, глыбей уключыцца ў практыку соцыялістычнага будаўніцтва, неабходна кожнаму тэатру распрацаваць пяцігадовы плян свайго разьвіцьця.

Нашай задачай зьяўляецца стварэньне бальшавіцкага мастацтва, стварэньне якога немагчыма без адзінарэволюцыйнага сьветапогляду—марксызму-ленінізму, бяз цеснай і непарыўнай сувязі з рабочай клясай. Пры складаньні пяцігодкі разьвіцьця тэатру неабходна кіравацца пастановамі XVII партыйнай конфэрэнцыі УсеКП(б) і рашэньнямі XIV зьезду КП(б)Б. Задачай кожнага тэатру зьяўляецца ажыцьцяўленьне праз тэатральнае мастацтва гэтых дырэктыў. Задача кожнага працаўніка мастацтва вывучыць гэтыя пастановы і на іх аснове весьці барацьбу за стварэньне пролетарскага тэатру.

Асноўнай задачай, якая стаіць перад тэамастацтвам БССР, гэта паказаць новага чалавека, паказаць сапраўднага героя нашага часу—ударніка, з усім тым новым, што ён нясе з сабой. Паказаць яго жывым, у разьвіцьці, а не ў статыцы. Угледзіць новае ў старым, у сёнешнім заўтрашняе. Паказаць будаўніцтва соцыялізму ў БССР, якое параджае новага чалавека, паказаць яго ва ўсёй глыбіні клясавых супярэчнасьцяй,—вось пачэсная работа для мастака, які жыве ў нашы дні, будні соцыялістычнага будаўніцтва, дні вялікай ленінскай эпохі.

Тэатр павінен стаць сапраўды мастацкім агітпропам партыі, які-б сродкамі мастацтва вёў барацьбу за генэральную лінію партыі. Гэтаму—ператварэньню тэатраў БССР у мастацкі агітпроп партыі—павінна садзейнічаць творчая тэатральная дыскусія.

Мастацтва павінна быць партыйным, яго трэба накіраваць на барацьбу за пераробку старога чалавечага матэрыялу, на барацьбу за комуністычнае выхаваньне маладога пакаленьня, здольнага весьці барацьбу за комунізм, трэба накіраваць на барацьбу з перажыткамі капіталізму, з усім тым, што перашкаджае будаўніцтву соцыялістычнага бясклясавага грамадзтва.

Мы змагаемся за стварэньне мастацтва—нацыянальнага па форме і пролетарскага зьместам. Некаторыя спрабуюць часам давесьці, што неабходна працаваць толькі над пролетарскім зьместам, нацыянальная-ж форма «прыложыцца сама па сабе», зводзяць нацыянальную форму выключна да мовы. Ці правільна гэта? Што такое нацыя?

«Нацыя гэта гістарычна-складзеная ўстойлівая супольнасьць мовы, тэрыторыі, экономічнага жыцьця, псыхічнага складу, які праяўляецца ў супольнасьці культуры» (Сталін).

Як бачыце, зьвесьці нацыянальную форму выключна толькі да мовы будзе няправільным, памылковым.

Значыць, у нацыянальную форму войдуць: мова, як адна з характарных рыс нацыі, тэрыторыя, экономічнае жыцьцё, накладзе пэўны адбітак і псыхічны склад, які праяўляецца ў супольнасьці культуры, пакажа, нам на якой стадыі разьвіцьця знаходзіцца тая ці іншая нацыя і г. д. і г. д.

Пытаньне нацыянальнай формы яшчэ мала распрацавана. Мне думаецца, што мы колектывам здолеем яго распрацаваць. Нашаму Інстытуту Літаратуры і мастацтва БАН неабходна стварыць брыгаду для распрацоўкі гэтага пытаньня.

Мы павінны і надалей весьці самую рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, які ўсімі сродкамі імкнецца перашкодзіць стварэньне нацыянальнага пролетарскага тэамастацтва, адначасова вядучы барацьбу з рэшткамі нацыянал-дэмократызму, з беларускім нацыянал-шовінізмам.

Нам трэба ў бліжэйшыя часы пры БелАПП'е склікаць тэатральную нараду, якая павінна садзейнічаць разгортваньню барацьбы з працягваньнем праз тэатральнае мастацтва розных шкодных, варожых нам тэорый. Трэба ў бліжэйшыя часы заняцца пытаньнем напісаньня гісторыі разьвіцьця тэатральнага мастацтва ў БССР. Гэта справа ўскладаецца на Інстытут літаратуры і мастацтва БАН. Трэба пры БелАПП'е і Драмтаварыства організаваць сэкцыю тэакрытыкаў, якія значна дапамогуць у разьвіцьці тэатральнага мастацтва БССР.

Тэатральныя кадры—гэта адно з вузкіх месц у разьвіцьці тэатральнай справы БССР. Тэатэхнікум дасьць кадры толькі праз 3 гады. Такім чынам на працягу гэтых трох год комплектаваць існуючыя тэатры, а таксама і наноўорганізуемыя, прыдзецца галоўным чынам за лік скончыўшых аднагадовыя драматычныя курсы. Ва ўсіх існуючых тэатрах трэба мець фабзавучы, якія-б падрыхтоўвалі патрэбную колькасьць актораў для гэтага тэатру.

У БССР няма ніводнага тэхнічна добра абсталяванага тэатральнага будынку. Неабходна ўжыць шэраг захадаў для таго, каб у асноўных індустрыяльных цэнтрах БССР пабудаваць тэатр. Вясной гэтага году прыступаем да будаўніцтва тэатру на 2.500 месц у Менску. Да Кастрычніка будзе закончаны пабудовай Бабруйскі тэатр. Гомельскі Горсавет ставіць пытаньне пра пабудову тэатру на 2.000 месц. Неабходна ў пляне другой пяцігодкі прадугледзіць пабудову ў раёнах дамоў соцкультуры, у якіх бавязкова будаваць сцэнічныя пляцоўкі з тым разьлікам, каб у іх маглі працаваць нашы вандроўныя тэатры, якіх да канца другой пяцігодкі будзе 35.

Такое шырокае разгортваньне тэатральнага будаўніцтва магчыма толькі ва ўмовах Савецкага Саюзу.

Праводзячы на справе ленінскую нацыянальную політыку, пролетарыят БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, а таксама супроць шовінізмаў іншых колераў, будуе нацыянальную культуру, літаратуру і мастацтва—нацыянальную па форме і пролетарскую зьместам.

Трыбуна творчай дыскусіі

ЗА КОНКРЭТНУЮ ЛІТАРАТУРНУЮ КРЫТЫКУ

Б. Кавдленка

Платон Галавач

Платон Галавач—адзін з асноўных беларускіх пролетарскіх пісьменьнікаў. Яго продукцыя, якая рэалізуецца ў зборніках «Дробязі жыцьця», «Хочацца жыць» і «Спалох на загонах» мае значэньне ня толькі з пункту погляду аналізу творчага росту самога Платона Галавача, але і як матэрыял, які адлюстроўвае шляхі разьвіцьця беларускай пролетарскай літаратуры наогул, бо творчасьць Платона Галавача для гэтых шляхоў разьвіцьця характарна.

Шэраг творчых асаблівасьцяй Платона Галавача характарны і для іншых беларускіх пролетарскіх пісьменьнікаў, для тэй часткі пролетарскай літаратуры, якая па свайму паходжаньню зьвязана з рэволюцыйным сялянствам.

Калі чытаем творы Галавача, мы наяўна гэтую сувязь адчуваем ня толькі па лініі тэматыкі, але і па лініі сьветапогляду, а таксама і па творчых асаблівасьцях.

П. Галавач шмат увагі аддае пасьлярэволюцыйнай вёсцы (іншы час дарэволюцыйны), паказваючы процэсы рэволюцыйнай барацьбы і клясавай дыфэрэнцыяцыі сялянства. У процэсе творчага росту П. Галавач пераходзіць да гарадзкой тэматыкі (часта ідучы ўсьлед за сваімі героямі, якія прыяжджаюць на вучобу ў горад) і ў сувязі з гэтым у сваіх новых творах імкнецца паказаць ролю рабочае клясы ў справе соцыялістычнае перабудовы вёскі. П. Галавач аднак ня цалкам асэнсоўвае ўсю складанасьць клясавых супярэчнасьцяй і ўзаемаадносін. У першым (ды і ня толькі ў першым) яго зборніку можна знайсьці творы, дзе моманты клясавасьці падкрэсьлены далёка не дастаткова, дзе клясавая барацьба адсоўваецца на другое месца вузка-бытавымі ўзаемаадносінамі і іншы раз проста паказваюцца фальшыва.

Можна спаслацца на апавяданьне «Кнак», дзе абмалёўваецца сялянская «цемра» (сварка з-за пасагу) мэтодамі эмпірычнага адлюстраваньня з налётам дробнабуржуазнай народніцкай клясавай абыякавасьці падыхода спрэс да сялянства.

«Культурная спадчына» дробнабуржуазнай народніцкай літаратуры ўплывае на ранейшыя творы П. Галавача, таксама як і на творчасьць некаторых іншых беларускіх (і ня толькі беларускіх) пісьменьнікаў сялянскага паходжаньня.

Гэты ўплыў выяўляецца ня толькі ў імкненьні да бытавізму, але і ў перанясеньня крыху папраўленых схем народніцкай літаратуры ва ўмовы рэволюцыйнай рэчаіснасьці. Папулярны ў старой літаратуры матыў юрлівага пана, які спакушае вясковых дзяўчат («наймічка») бярэцца П. Галавачом у аснову апавяданьне «Загубленае жыцьцё», поруч з падменай клясава-акрэсьленай ідэалёгічнай трактоўкі тэмы і тыпаў дробнабуржуазным гуманізмам і сэнтымэнтальным мора-лізатарствам.

Налёт ідэалізацыі і абмежаванасьці сьветапогляду выяўляецца таксама у характарным схэматызме, калі аўтар паказвае рэволюцыйны бок рэчаіснасьці і тыпаў, якія павінны супроцьстаяць «несправядлівасьці» клясавага ворага. Так паказана жэнаорганізатарша, якая «сядзела над разгорнутай кніжкай, думала аб жаночай долі».

Уплыў народніцтва оказваецца і на элемэнтах спэцыфічнай «просьветительской» мовы з яе абстрактнай ідэалістычнай тэрміналёгіяй вобразнасьцю.

«Больш сьвету трэба ў гэтыя цёмныя вёскі, перарабіць іх трэба па новаму, ўнесьці сьвядомасьць, новае лепшае жыцьцё, новыя нашы комуністычныя погляды на жыцьцё трэба ўнесьці ў маленькія шэрыя хаты».

Неадымнай часткай народніцкіх ўплываў, якія напластаваліся на ранняй творчасьці Галавача, зьяўляецца таксама ідэалізацыя прыроды, якая дапамагае аўтару выявіць свае сантымэнтальныя адносіны да рэчаіснасьці і якое спачувае «станоўчым» пэрсонажам і асуджае за ўчынкі «адмоўных».

«Не! Не! Я маладая, здаровая вынесу сваю ношку».

А бярэзіны старыя шумелі, здавалася, сьмяючыся: «Не, ня вынясеш! ня вынясеш!» і як-бы круцілі сваімі старымі кудластымі галовамі, што ня вынясе Ніна ношкі жыцьцёвай сваёй».

Лёгка ўпэўніцца ў тым, што ўсе гэтыя асаблівасьці раньняй творчасьці Галавача сьведчаць аб недастатковай выпрацаванасьці сьветапогляду аўтара, як пролетарскага пісьменьніка, і аб значных дробнабуржуазных уплывах на яго творчасьць, а гэты факт быў сур'ёзным тормазам у справе творчага разьвіцьця П. Галавача і выпрацоўцы паглыбленага паказу клясавых процэсаў рэчаіснасьці. Памылкова-б было судзіць аб раньнім пэрыядзе творчасьці Галавача толькі па найбольш слабых творах, хоць слабыя бакі раньняга пэрыяду давалі сябе адчуць і ў пазьнейшай продукцыі. Асноўнае якаснае адрозьніваньне П. Галавача, як і іншых пролетарскіх пісьменьнікаў, якія маюць агульныя з ім творчыя асаблівасьці, гэта імкненьне, пры ўсіх паасобных памылках паказаць клясавы пераплёт на вёсцы з пролетарскага пункту погляду выявіць рэволюцыйны бок рэчаіснасьці.

Клясавую дыфэрэнцыяцыю сялянства і спробы кулацкай верхавіны самкнуцца з гарадзкой буржуазіяй («выйсьці ў людзі») паказвае Галавач у апавяданьні «Суседзі», даводзячы біографію асноўнага пэрсонажу—кулака—да савецкіх часоў. Кулак Халімон варожа настроены ў адносінах да савецкай ўлады, хоць і крыху палахлівы. Спадзеючыся на лепшыя часы, ён зьвязваецца з бандытамі прымае ўдзел у забойстве вясковага комсамольца.

П. Галавач і ў сваіх параўнальна лепшых творах ня можа перамагчы ідэалізацыі і схэматызму ў паказе «станоўчых пэрсонажаў». Гераіню апавяданьня «Дасужая» «новага чалавека» беларускай рэволюцыйнай вёскі (комсамолка, перадавая беднячка, якая імкнецца вучыцца каб з большым посьпехам працаваць над соцыялістычнай перабудовай вёскі (аўтар надзяляе спэцыфічнымі рысамі, характарнымі для народніцкай інтэлігенцыі ў адлюстраваньні народніцкай-жа літаратуры (абстрактна-ідэалістычныя, дробнабуржуазныя гуманістычныя імкненьні, спачуваньне беднаму народу, романтычная лятуценнасьць і г. д.).

У раньніх апавяданьнях, прысьвечаных гораду, П. Галавач імкнецца пашырыць кола сваёй тэматыкі, але таксама ідзе пераважна па лініі эмпірычнага адлюстраваньня быту (каханьне да клясава-варожых людзей, як аснова апавяданьня «Абмылілася», і выпадкі буржуазнага перараджэньня на глебе каханьня—«Даляры»).

Рабочыя, якія спатыкаюцца ў некаторых апавяданьнях П. Галавача на гарадзкія тэмы, паказаны схэматычна і не індывідуалізавана, за выключэньнем некаторых пэрсонажаў (Соня з «Даляроў»), якія нічым характарным для рабочага не адрозьніваюцца.

Мы маем у творчасьці П. Галавача гэтага, больш позьняга пэрыяду і неперамоўжаны цалкам уплыў дробнабуржуазнага об'ектывізму, паглыбленьне ў індывідуалістычную псыхолёгію, без дастатковага выяўленьня клясавай якасьці пэрсонажаў.

Уплыў дробнабуржуазнага «об'ектывізму» асабліва моцна сказаўся на аповесьці П. Галавача «Вінаваты».

Асноўная ідэя аповесьці—ці павінен сын пакутваць «за грахі бацькоў», аб якіх (грахох) ён, назат, ня ведаў. Аўтар дае «трагэдыю», партыйца, соцыяльна-чужога паходжаньня, які шчыра хоча працаваць у партыі, але яго выключаюць за соцыяльнае паходжаньне: бацька яго (як выявілася) да рэволюцыі служыў у ахранцы, чаго партыя ня ведала.

«Проблема» не асабліва характарная, а галоўнае, не асабліва значная для інтарэсаў клясавай барацьбы пролетарыяту.

Аўтар прысьвечвае гэтай «проблемы» аповесьць, прычым даводзіць «аб'ектывізм» трактоўкі пэрсонажаў да асабліва буйных ідэолёгічных правалаў, напрыклад, у паказе бацькі-ахраньніка, па ходу аповесьці прадстаўленага нядрэнным чалавекам, які толькі дзякуючы сваёй нявопытнасьці, «паступіў на службу» ў ахранку.

Аповесьць «Вінаваты» паказвае, куды можа завесьці нават пролетарскага пісьменьніка захапленьне дробнабуржуазным «об'ектывізмам», нясумяшчальным з рэволюцыйнай ідэалёгіяй пролетарыяту.

Апошняя аповесьць П. Галавача «Спалох на загонах» ня толькі сьведчыць аб значным, хоць і далёка неканчатковым ,перамаганьні аўтарам шмат-якіх раньніх памылак і варожых уплываў, але і аб прыкметным творчым росьце параўнальна з творамі папярэдняга пэрыяду. У гэтай аповесьці П. Галавач бярэ за аснову не наносную ад дробна-буржуазнай літаратуры «праблему», а адзін з вузлавых момантаў клясавай барацьбы на сучасным этапе—процэс колектывізацыі вёскі, ярка паказваючы ня толькі соцыялістычную перабудову экономікі вёскі, але і ломку старой дробнаўласьніцкай псыхолёгіі і быту, парасткі новага быту і элемэнты новай псыхолёгіі.

Павялічэньне ў параўнаньні з папярэднімі творамі разнастайнасьці тыпаў (беднякі, кулацтва, рабочыя, партыйцы), больш паглыблены паказ гэтага тыпажу ў шчыльнай сувязі з клясавай практыкай, тыпізацыя і абагуленьне матэрыялу на павышанай ідэёвай аснове, усё гэта разам узятае зьмяншае яшчэ захаваўшыяся недахопы раньняга пэрыяду, хоць і не пазбаўляе аповесьць ад неперамоўжаных да канца элемэнтаў схэматызму, ідэалізму эмпірызму.

Асабліва важна (калі казаць аб ідэёвым баку аповесьці) тая абставіна, што П. Галавач разглядае барацьбу за колектывізацыю неяк ізоляваны калалак быту, а як частку агульнай політыкі соцыялістычнага наступу ,імкнучыся ўвязаць барацьбу за колектывізацыю з агульнымі задачамі соцыялістычнага наступу і імкнучыся падкрэсьліць вядучую ролю горада і партыйнага кіраўніцтва ў гэтай барацьбе. Лініі сувязі гораду і вёскі ў аповесьці досыць разнастайныя. Кулакі хаваюць хлеб і выкарыстоўваюць хлебныя запасы, як адзін са сродкаў эксплёатацыі беднаты, гарадзкая буржуазія і мяшчанства ў горадзе спэкулююць на часовых цяжкасьцях, раздуваюць паніку і павялічваюць «хвасты» за хлебам, правыя опортуністы выкрываюць сябе, як агентуру кулака на вёсцы (адмаўляюцца ехаць на вёску выпраўляць чужыя «перагібы», абмяжоўваюцца на вёсцы агульнай агітацыяй, ухіляючыся ад конкрэтнай барацьбы і організацыі бедняцка-серадняцкіх мас), гэтыя-ж опортуністы па бытавой і політычнай лініі («опозыцыйнае незадавальненьне») змыкаюцца з прадстаўнікамі гарадзкой буржуазіі і мяшчанства (прылучаюцца да гэтага і момант вялікадзяржаўніцтва).

З другога боку мацнее і рабоча-сялянскі фронт у асобе, праўда, усё яшчэ ідэалізаваных і схэматычных партыйных работнікаў на вёсцы, якія праводзяць лінію партыі (Панас), у асобе конкрэтнага кіраўніцтва цэнтральных організацый (вобраз старога), у асобе рабочых падмацаваньняў, якія робяць вытворчую дапамогу колгасьнікам (Чурыла).

П. Галавач не баіцца паказваць цяжкасьці клясавай барацьбы, упартае супраціўленьне кулацтва, дэмагагічную агітацыю, характарныя правакацыйныя пытаньні рэплікі на сходах, тэрорыстычныя выступленьні, хістаньні серадняцкіх і бядняцкіх мас (хаваюць частку маёмасьці, разьбіраюць пад уплывам кулацкай агітацыі абагуленых кароў і г. д.).

Паказвае аўтар і ўпартую барацьбу з цяжкасьцямі, організацыю бядняцка - серадняцкіх мас для барацьбы супроць кулацтва. Досыць ярка дадзены бедняк Клемс, актывіст-колгасьнік, які перамагае «опозыцыю» жонкі і яе бытавы консэрватызм,—апошняе аднак не без схэматызму (паляць абразы).

І ўсё-ж пры ўсіх станоўчых баках аповесьці—шмат яшчэ недаапрацавана ў тым ліку і па лініі ідэёвай.

Недастаткова паказаны процэс барацьбы на два фронты (адсутнічае ў аповесьці паказ «левацкіх» загібаў у правядзеньні колектывізацыі, недастаткова пераканаўча (надта агульна) агітацыя за колектывізацыю ў адрозьніваньне ад досыць «закавырыстых» і «дзелавых» «аргумэнтаў» падкулачнікаў і ярчэй выяўленых сур'ёзных сумненьняў радавога сялянства. Ня толькі опортуніст Асьцюк, але і яўна ідэалізаваны (па старой памяці) прадстаўнік партыйнай лініі Панас галоўным чынам апэлююць, ды і то ў надзвычай агульнай форме, да рэволюцыйнай сьвядомасьці сялянства, і мала гаварыць аб конкрэтных выгадах, якія бядняцка - серадняцкае сялянства атрымае ў выніку колектывізацыі.

Гэтую карысьць аўтар часткова дэмонструе ў процэсе разьвіцьця дзеі аповесьці, а галоўным чынам спасылаецца на прыклад комуны, якую паказвае з дозай лякіроўкі і не без адценьня спажывецкага падыходу (падкрэсьліваецца, што комунары жывуць сытна і ў выгадзе, але не паказваецца, якую карысьць яны даюць дзяржаве, не паказваюцца цяжкасьці ў рабоце комуны).

Вельмі безнадзейна малюе аўтар «аднаасобную» вёску; у прымітыўна-алегарычнай форме паказвае «сялянскую долю» да рэволюцыі, сымболізуючы дарэвалюцыйнае бядняцкае сялянства ў народніцкім вобразе дзеда-ратая, які сваёй песьняй расчуліў да сьлёз маладога тады яшчэ Панаса, у далейшым організатара колгасу.

Аповесьць ад недахопаў далёка ня вольна, наогул кажучы матэрыял аповесьці можна было-б разгарнуць шырэй і паказаць паўней, аднак, і ў гэтай рэдакцыі апошні твор. П. Галавача сьведчыць аб творчым росьце аўтара і разам з тым падкрэсьлівае неабходнасьць далейшай барацьбы за аўладаньне марксыцка - ленінскім сьветапоглядам і мэтодам дыялектычнага матэрыялізму.

ЗАЎВАГА. Артыкул т. Б. Каваленкі друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Р. Мурашка

Ці баяздольная часопісь „Маладняк"?

(з выступленьня на дыскусіі)

Перад часопісьсю «Маладняк» як і перад усім пролетарскім літаратурным рухам на 1931 г. сталі дзьве асноўныя політычныя задачы: тварам да вытворчасьці і заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру.

У сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня 1930 г. аб мобілізацыі ўсіх сіл на ліквідацыю прарываў прамфінпляну, БелАПП упяршыню стварае сталыя пісьменьніцкія брыгады, прыцягваючы да работы ў іх і спадарожнікаў, для штодзеннай работы на фабрыках і заводах. Адгэтуль пачалася шырокая разгорнутая работа па організацыі рабочых літгурткоў, работа па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру.

Часопісь «Маладняк» слаба ўключылася ў правядзеньне літаратурна-масавай работы і ў гэтым хаваецца адзін з асноўных недахопаў часопісі. Праўда, у процэсе работы з паасобнымі рабочымі-ударнікамі часопісь зьмясьціла і зьмяшчае на сваіх старонках творы Гэльфэра, Гуцава, Мурзо, Ушакова, Грахоўскага, але гэтага ні у якай меры нельга лічыць здавальняючым на сёнешні дзень. Паглыбленьне і разгортваньне закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру ўзбудзіла ў рабочай грамадзкасьці вялікую зацікаўленасьць да літаратуры. Літгурткі на прадпрыемствах у сваёй крытычнай рабоце даюць колектыўную крытычную ацэнку паасобным творам пролетарскай літаратуры, выходзячы з асноўнага лёзунгу, што мастацкая літаратура павінна быць зброяй клясавай барацьбы. «Маладняк» організуе на сваіх старонках упяршыню ў гісторыі часопісі аддзел рабочае крытыкі. Адначасова часопісь аддае пяма ла ўвагі крытычнаму разгляду творчасьці рабочых ударнікаў, прыцягваючы для гэтага новыя крытычныя сілы з ліку асьпірантаў, студэнтаў, якія працуюць у галіне літаратуры.



У пляне агульнай барацьбы за пяцігодку ў чатыры гады перад пролетарскай літаратурай і перад часопісьсю «Маладняк» паўстала задача паказу ў мастацкіх вобразах герояў пяцігодкі, рабочых-ударнікаў соцыялістычнае будоўлі. На старонках часопісі пад уплывам неабходнасьці выкананьня гэтае задачы зьявіўся аддзел «Краіна павінна ведаць сваіх герояў». Пры гэтым трэба адзначыць, што часопісь не вяла паглыбленай работы з асноўнымі кадрамі супрацоўнікаў і ў выніку—адлюстраваньне барацьбы за магнітабуды літаратуры не знайшло належнага месца ў часопісі.

Часопісь павінна адыграць вялікую ролю ў організацыі і разгортваньні творчай дыскусіі ўнутры пролетарскай літаратуры, як цэнтральны орган БелАПП. Трэба адзначыць, што часопісь не стаяла на вышыні гэтага запатрабаваньня: зусім мала аддавалася ўвагі пытаньням тэорыі, творчага мэтоду пролетарскай літаратуры, слаба організавана конкрэтная крытыка.

Слабасьць конкрэтнае крытыкі ў значнай меры перашкаджае творчай перабудове нашых спадарожнікаў. Але трэба адзначыць, што «Маладняк» у 1931 г. мае пэўныя плюсы ў гэтых адносінах. Так, дзякуючы ў пэўнай меры ўплыву рэдакцыі, на старонках часопісі зьявілася аповесьць Пятруся Броўкі «Каландры», якая сьведчыць аб значным творча-ідэолёгічным росьце пісьменьніка і якая прыводзіць яго ад саюзьніцтва ў шэрагі пролетарскай літаратуры.

Быў зьмешчаны цэлы шэраг артыкулаў і рэцэнзій пра творчасьць Юл. Таўбіна, Астапенкі, Кулешова, Кузьмы Чорнага, Сымона Баранавых, што ў значнай меры дапамагае таварышом у іх творчай перабудове. Але ўсё гэта нельга лічыць завальняючым. У даным выпадку конкрэтная крытыка ў часопісі павінна быць разгорнута значна шырэй.

Як дадатны момант у часопісі трэба адзначыць тую ўвагу, якую яна аддавала пытаньню інтэрнацыянальнае сувязі, вынікам чаго зьявіліся прысьвечаныя баўгарскай, чэха-славацкай, польскай і часткова нямецкай рэволюцыйнай літаратуры тры нумары. Пры сучасным абвостраным міжнародным становішчы, ва ўмовах небясьпекі ўзброенай інтэрвенцыі супроць Савецкага саюзу ўзмацненьне гэтай сувязі побач з большай увагай абароннай тэматыцы павінна адыграваць вялікую ролю.

М. Мэеровіч

Апалёгетыка плеханаўска-пераверзеўскага меншавізму

Энгельс у адным лісьце да Маркса пісаў: «Последняя книга Дюринга имеет то преимущество перед остальными, что из нее легко можно цитировать ее собственные нелепости». Вось такую менавіта «перавагу» мае артыкуль **т. Куніцкага** пра творчасьць Сымона Баранавых («Маладняк» № 1, 1931 г.). Артыкул пад шыльдай архі-рэволюцыйных фраз хавае апалёгетыку памылак Плеханава-Пераверзева, памножаную на эклектызм самога аўтара.

Паставіўшы сабе задачу прааналізаваць тую сыстэму вобразаў, якія аўтар дае ў творы, і застанаўліваючыся на высьвятленьні самога разуменьня «вобраз», наш цытатмахер падае «ортодоксальную» цытату з Фрычэ аб тым што: «творчасьць мастака тым аздрозьніваецца ад творчасьці вучонага, што ён будуе свой сьвет ня з ідэй **(падкрэслена мною)** а з вобразаў. Самыя вобразы могуць быць рознага зьместу: вобразы рэчаў—не псыхолёгічныя і вобразы чалавека—псыхолёгічныя». Нечага і казаць, што Фрычэ трактуе тут вобраз па-пераверзеўскі, а наш крытык апалёгічна ўспрыймае няправільныя ўстаноўкі, якія даюць права сказаць, што ня ідэя ня клясавая ўстаноўка што ня ідэя ня клясавая ўстаноўка аўтара організуе дадзены мастацкі твор, а вобраз. Зусім зразумела, што тут працягваецца старая перавезеўская ідэйка аб організуючым твор вобразе, аб самастойным яго існаваньні. Гэтым самым наш крытык салідарызуецца з няправільнымі палажэньнямі Плеханава аб тым што «область науки рассудочная, а область искусства — восприятие», палажэньнямі, якія адгароджваюць кітайскай сьцяной лёгічнае мысьленьне ад вобразнага мастацтва ад публіцыстыкі.

Разабраўшы такім чынам «вобразы і ідэю» дадзенага твору, наш тэорэтык з вышынь плеханаўскай мэтодолёгіі вызначае ступень мастацкасьці твору. Які-ж крытэры мастацкасьці пакладзены крытыкам у аснову? «Ужо тое, што «Чужая зямля» у асноўным па сваёй форме адпавядае самому зьместу і ідэі аповесьці, кажа, што яна заслугоўвае ўвагі з мастацкага боку... і композыцыя і пэйзаж цалкам адпавядаюць яго ідэі. Гэта сугучнасьць ва ўсіх компанэнтах сьведчыць аб ступені мастацкасьці». Тэорыя, як бачыце, ня новая. Тэорыя, якую абгрунтаваў Плеханаў. Плеханаў кажа: «чым больш адпавядае выкананьне замыслу, ці каб ужыць больш агульны тэрмін, форма мастацкага твору адпавядае яго ідэі, тым яно больш удала» *). Як відаць, тут зусім зьнімаецца пытаньне аб мастацтве, як спэцыфічным выражэньні клясавай ідэолёгіі, яно падменьваецца ўнегістарычным абстрактным крытэрыем хараства, што лёгічна вядзе да таго, што тут магчыма разглядаць мастацтва ізолявана ад усіх клясавых ідэолёгій, імонэнтна.

Барыс Мікуліч

Сустрэчы

(ўрывак з аповесьці „Ускраіна")

Густы—клейкі—пыл услаў дарогу. Дарога ідзе проста ўгору. Навокал клейкай гэтай дарогі: лясы і пералескі, яры і юры, абмярэжаныя дрыгвой, і сонца над гэтым усім—старанна вычышчанай патэльняй—буяе густым—клейкім—жарам.

Ногі баляць млявым і салодкім гэткім болем, брэзэнтовы чамайданчык за плячыма, здаецца, напоўнены ворам—гэты вор ліецца з чамайданчыка па сьпіне, за каўнер, разьліваецца па ўсім целе. Гэта сонца няўрымсьлівае —шукае мясьцін—пераходаў, праходаў, хадоў—яшчэ неаблашчаных гарачым абмацваньнем сваіх праменьняў.

Густая, млявая, клейкая стаіць у паветры цішыня, і цішыня гэтая апанавала блакітнае скляпеньне неба, якое ні даць, ні узяць—дзівоснай пекнаты сподак, венцамі абаперлася па зямлю. Бяскрайняя і бязьмежная стаіць цішыня ўвысь і ўшыркі над зямлёй і, здаецца, што цішыня афарбавана ў блакітны—жоўтага адценьня—колер.

І вось у гэтую цішыню—бяскрайную жоўта-блакітную цішыню ўрываецца раптам густое і цяжкое—наяўна, ад густога клейкага пылу—паскрыпваньне колаў.

Антось паварочваецца на гэтыя гукі. Захінае вочы, і тады краявід, заліты сонцам, выступае перад ім пуката, ва ўсіх сваіх строгіх дэталях.

Цягнецца конік, ахутаны воблакамі пары і пылу. На вазу пачарнеўшая ад сонца асяка. На ёй—з жаўтаватых дошчак зробленая труна. Нехта варушыцца ля яе. За возам ідзе чалавек. Ногі ён расстаўляе шырока: яны вялізарныя—гэтыя ногі, на іх грубыя боты; спрэс пакрытыя пылам, пыл ляжыць на ботах роўным густым напластам. Пакіўвае галавой конь і ў тахт гэтаму пакіўваньню ступае чалавек.

Антось чакае пакуль воз параўнаецца з ім. Вось ужо даляцеў да яго і лёг на зямлю пыл, што вырваўся з-пад конскіх ног.

Антось цяпер добра можа разгледзіць чалавека.

Апусьціўшы долу вочы, ідзе ён за возам, на якім стаіць толькі-толькі відаць зробленая труна. У чалавека чорныя валасы парабіліся ў космы—ад поту і сьпекі. Кашуля прыліпла да грудзей: праз яе праступілі тугія лініі сухаватага мужчынскага цела.

Ля труны сядзіць дзеўчынка. Гадоў ёй восем-дзевяць. Аж на вочы насунулася вялізарная шапка—з бацькавай, відаць, галавы. Абапіраючыся локцем на века труны, са шчасьлівым



выразам на твары, яна цягне танклявым галаском вясёлую песеньку.

І як ня быць шчасьлівым у гэткі век, калі багатым і пекным стаіць наўкольле, зачараваная густым сонечным жарам!

— Добрага дня...

Чалавек узьняў вочы, потым зірнуў на труну, позірк затрымаўся на дзеўчынцы каля яе, і Антосю здалося, што чалавек слаба-слаба ўсьміхнуўся.

— Калі не жартуеш, дык добры...

Яны пашлі побач. Дзеўчынка сьціхла і, утаропіўшы вялікія свае вочы ў антосевы ногі, застыла на возе.

— Каго гэта?

Відаць было, што чалавеку цяжка гаварыць, ці, проста, ня хочацца гэтага, ён адно махнуў рукой і ціха сказаў:

— Жонку...

Раптам дзеўчынка пачала цёрці вочы кулачонкамі, губы раз-по-раз пачалі ўздрыгваць,—яна заплакала.

— Ціха ты, дурненькая,—сказаў чалавек мякка і ласкава.—Вось за труну ўзялі трыццаць рублёў,—сказаў ён да Антося, каб хаця адвесьці ўвагу сваю ад заплакаўшага дзіцяці.

— Дрэнная,—ацаніў Антось.—Шчыліны наскрозь сьвецяцца...

— Эт, будзе добра.. У зямлі ўсё добра...

Ніякавасьць авалодала Антосем. Ён надумысьля адышоў на край дарогі, дзе стаяла раскідзістая ігрушына—дзічка, і—даўшы шчасьлівай дарогі—прысеў адпачыць.

Усё вышэй і вышэй ішло сонца. Ходзіць сонца ў ліпені павольна, з павагай, шчодра льючы на зямлю свой жар, а засмаглая зямля ляжыць неўтрапеннай песьцячы свае плёны.

Так вось ішоў Антось, робячы частыя прыпынкі, каб хаця адпачылі ногі, ішло над ім сонца, ішло навакольнае: юры, яры, лясы, пералескі, дрыгва.

Ціха і зазыўна прапяяла наперадзе пастуховая сурма.

— Цім-па-пі-па-рам!..

Чуў гуд сурмы і ўсплывалі на паверхню памяці акраўкі ўспамінаў. І вось так заўсёды—ў родныя мясьціны прыдзеш, дзе ня быў ужо каторы год, і самая звычайная пастуховая сурма здасца нечым дзіўным і нязнана-чароўным. І акурат ўспомніш сябе дзіцёнкам, мальцом, узьвей-ветрам, забавы свае дзіцячыя захочаш паўтарыць, нібы сьцінеш з плеч дзесятак гадоў. Яшчэ-б хоць раз перажыць радасьць, паспытаць асалоды ад таго, што дзед Савось дазволіў такі прыкласьці сурму сваю мядзяную да роту, напяць грудзі і затрубіць:

— Цім-па-пі-па-рам!..

І дзіўная рэч: ён убачыў перад сабой старога—спрэс пасівелага—чалавека, які сядзеў на пні, падтыкаючы сьвежым лыкам лапаць. Антось аж зьдзівіўся. У першую хвіліну ён ня верыў сваім вачом, бо дзед на пні быў працягам антосевых думак (у разорах—пры лесе—у гарачыя дні, калі апошні пар аддае зямля, бывае: на фоне сініх нябёс—марыва). Зьдзіўленьне зьнікла само сабой, бо дзед узьняў вочы на Антося і прыветна запытаўся:

— Ці ня руднянскі будзеш ?

— А хіба дзед адтуль?..

Дзед паклаў на зямлю лапаць і, падмацоўваючы свае словы густой ухмылкай, адказаў:

— Век у Рудні жыў, у ёй і памру відаць... А ты часам Сьцяпану Крыніцу ня свой?

— Сын яго...

Нібы па згодзе, яны падышлі адзін да аднаго, абняліся і моцна пацалаваліся тры разы.

— Эх, ты, малец, дзеда свайго не спазнаў... Закруцілі гады, гэта верна...

Перад ім быў дзед Савось, той самы дзед Савось, які вучыў Антося граць на сурме, прыгаворваючы:

— Вучыся, дзетку, на благі дзень можа і хлеба заробіш.

Яны сядзелі адзін каля аднаго, распытваючы, дзівячыся. Стары апавядаў пра тое, як зьмянілася жыцьцё ў Рудні, як клопат быў, калі запісаліся ў колгас, як засталося ў гэтым самым колгасе чатырнаццаць гаспадароў.

— А ты ў поле даўно ганяеш?

— З вясны.. Тут вось і колгасныя і сялянскія каровы... Чужы хлеб есьці ня хочацца, дужы яшчэ...

Паўз іх прабегла чырвоная цёлка, б'ючы свае бакі гладкім хвастом. Усьлед за ёй, выробляючы нагамі выкрутасы, рушыў прыгажун- бык з вялізарнай белай плямай на пляскатым ілбе. Напаўдарозе бык прыпыніўся і, пазіраючы ленаватымі сваймі вачыма на Антося, ціха замычэў на яго. Дзед Савось устаў і працягнуў да яго руку. Бык абнюхаў яе, потым аблізаў ні даць, ні ўзяць малое цялё, і відаць было, што гэтым самым выказвае бык сваю прыхільнасьць да дзеда.

— Ну, ну, ідзі, забаўляйся, дурны, — пагладзіў дзед Савось быкаву пысу. — Цёлкі вунь млеюць, гізуюць. —Паглядзеў на сонца і дадаў: — На дождж і не чакай...

— А як жніво? — запытаў Антось, баючыся парушыць дыялёг дзеда з быкам.

— Жніво? Колгас жняярку з Заазер'я прыгнаў, дык у іх там на дні тры... А ў гаспадароў слаба...

Наўздалёк ляжала Вялікая Рудня. У два шнуры сталі хаты, а пасярод іх — угору ішла дарога. Вачыма Антось адшукаў клён, што стаяў на самай гары. Ад гэтага клёну ішла вузкая — аднаму возу праехаць — дарога ў стружку.

Дарогу гэтую відаць было з вакон іхнай хаты.

Прачнуўся ён позна. І ледзь толькі расплюшчыў вочы, адчуў нейчы упарты позірк. Усхапіўся і стрэўся вачыма з позіркам матчыным. Усьміхнуўся ён сыновай цёплай усьмешкай.

Яна сядзела на лаве, сухенькая, зморшчаная, падабраўшы пад даўгі свой андарак ногі. У хаце было чыста падмецена, і пах пылу перамяшаўся з пахам чагосьці печанага. На столі і на сьценах гармідарылі мухі.

От, заспаўся, — сказаў ён, згартаючы з ног посьцілку. — І ў печы ўжо выпалілі?

— Толькі таго клопату, Антоська, з дарогі потым змарыўся.

Ён хутка апрануўся, вышаў на ганак памыцца. Маці прынесла конаўку вады.

— Хадзі сюды, над карытам памыйся.

Ён нахіліўся над зялёнай роўнядзьдзю карыта і ўбачыў адлюстровак свайго твару. Усьміхнуўся: за ўчарашні дзень як ішоў у Рудню, сонца асмужыла твар.

Маці палівала на рукі.

— Дзе Волька? Я ўчора забыўся папытаць...

— Хіба не казала? Як прышоў твой ліст, дык і закруціла. І гэтак у хаце дужа не рабіла, а тут ты напісаў і пашла ў колгас, з Юзікам запісалася.

— Добра жывуць?

— Эт, як яно ўжо там жывецца, на людзі-ж ня выносяць.

Пасьнедаўшы, Антось выцяг з чамайданчыка вялізарную цёплую хустку (яшчэ перад тым, як у больніцу трапіў, купіў у гаспадыні сваёй), разгарнуў яе на калена, пагладзіў рукой і, перадаючы матцы, сказаў:

— Гэта, мама, вам, зімой будзе ў самы раз...

Расчуленая сыновым клопатам, старая абціхала рогам хусткі сьлёзы. Няёмка крыху было Антосю ад гэтых матчыных сьлёз, але разам з тым — неяк цёпла, хораша адчуваў ён сябе.

— От ты кажаш у колгас ісьці,—казала маці, хаваючы пад андарак ногі, ад назальлівых мух. — Хіба я наўпрэк каму станаўлюся? Волька пашла, і я слова не сказала. Андрэя выдзяліла, якраз першым у колгас запісаўся. У мяне ня пыталіся, я і маўчала. От,. таксабе з Юркам і жывем, я каля хаты, ён у полі. Хлеба потым ёсьць.

—А хіба вам, мама, у вашыя гады аб хлебе думаць Жылі-б сабе пры Андрэі, а гэтак — супраць дзяцей выходзіць...

На стары — сухенькі — яе твар ад слоў сыновых легла цень журбы, вочы — блёклыя і празрыстыя — глядзелі на сына, але той зразумеў, што маці ня бачыць яго, што тугія думы вал-за-валам у галаве старой ходзяць, што глядзіць маці ў свае ўласныя думы.

— Мо' яно І так выходзіць,—уздыхнула яна нарэшце. — Але от зірні на старога, на дзеда, ківаецца, не сступае.... — Потым зноў маўчала, і адно чуваць было, як жужжаць у хаце мухі.—Паласа ў нас вузкая, дый хата потым ледзь-ледзь стаіць. Усё на сьвеце старэе... От-жа ня гэтага шкада, не... Будаваліся, гаравалі... Скаціна падала... Потым на каня ўзьбіліся, як бацька твой захварэў. Ох-ха... Лепшага жытка ня прычакаў, небарака...

— Але-ж Андрэй новае жыцьцё ладзіць... У іх там гурт, разам біду адолець лягчэй... Чаго-ж вам шкадаваць, мама?

Яна ўстала з лавы, падышла да печы, узяла з прыпека гладыш, што абсыхаў на ім, і Антось успомніў, што гэты самы гладыш аплятаў дротам яшчэ бацька.

— Багацеямі мы ніколі ня былі,—дадаў сын.

— Не, Антоська, не багацьця мне шкада... Гора мне свайго шкада, гора свайго, — сказала яна і ў яе вачох прыкмеціў Антось страх ад таго, што сын матчыных слоў не зразумее.

Па-праўдзе сказаць, ён і не разумеў іх, але сказаць пра гэта адкрыта не адважваўся, бо ведаў, што старая абразіцца і абразіцца не за сябе, а за яго, за сына свайго, за тое, што ён за гэтыя гады, як адбіўся ад вёскі, набыў іншыя погляды і гэтыя погляды былі рэзка супроцьлеглымі поглядамі яе. Апошняе Антось разумеў добра.

Увечары прышоў Андрэй. Ён аброс барадой, схудаў, але ў вачох стаяў ўпарты бляск пераможнай гэткай, крутой сілы. Расказваў про колгас, пра тое, як цяжка рабіць ім, бо кожны намагаецца шпільку падпусьціць, ушчыкнуць неўзаметку. І тут разумеў Антось усё. Разумеў і бачыў, што ня толькі яго, але і братавы разважаньні супярэчаць матцы. Гэта ўзрадавала яго.

— Страсянулі іх здорава, — казаў брат нізкім грудным сваім голасам. —Але спакою няма покуль што, прыходзіцца ня верыць бадай і родным... Вось скажы ты... Агейчыка выслалі, ну, а брата яго, Кандрата, не чапалі. Як яго возьмеш? Чалавек ён не багаты, з братам у згодзе ня жыў, заўсёды адзін на аднаго нагаварвалі. А цяпер сычом глядзіць, а ні блізка.

— Як не кажы, крыві шкада, за брата, мусіць крыўдзіцца. Які гэта Кандрат тымчасам?

— А помніш Рузю? Твой гэты самы Костусь Кубянкоў круціў з ёй? Гэта яе бацька.

— Ааа! Гэта яна з ім у лес па дровы езьдзіла?

Абодвы зарагаталі. Потым Андрэй павёў брата пахваліцца колгаснымі навінамі.

Вечар стаяў месячны. Белы, гладкі, нібы твар маладзіцы, стаяў над сялом гэты месяц.

Было пуста. Ішлі яны моўчкі. Андрэй толькі і заўважыў адно:

— Левая ў цябе крыху... Нага...

— Гэта я скінуўся. Загаілася ўжо.

Раптам з цемры — пад самыя антосевы ногі — выкаціўся нейкі камяк. Той аж адступіў. Але ў наступную хвіліну пачуў андрэевы словы:

— Пашоў, паршывы!...

Цёмны камяк неяк жаласна заплакаў, закудахтаў — і перад Антосем вырас абшарпаны, скручаны нейкі чалавек.

— Іііхіхахо!.. Агонь бяжыць, певень бяжыць, баба бяжыць!.. — кудахтаў, выкручваючыся, нібы гліст, чалавечак. — Агонь у печ, певень у бабу, бяжыыыць...—Упаў, зноў, абпоўз уросшага ў зямлю Антося і зьнік у цемры.

— Цьфу!—плюнуў Антось.—Хто гэта?

— Ат, нейкі... Прыблудзіў у вёску, а яго гэты самы Кандрат у варыўню пусьціў. — Андрэй плюнуў таксама.

Абмінуўшы хату, у якой жыў Андрэй, яны вышлі на аселіцу. Антось убачыў вялізарную новую будыніну. Шукаючы у кішэні ключ, Андрэй казаў:

— Колгас наш сьвінаводчым будзе. От чакаем, мусяць сорак сьвіней прыгнаць нам. Сваімі рукамі сьвінарнікі пабудавалі, — у братавым голасе прагучэлі ноткі гонару. — Ад самой вясны будуем... палац гэты, а яшчэ няўправіліся страху пакласьці, людзей няма. Грошы далі, але дзірак багата, выкучваемся па-крысе.

У сьвінарніку Андрэй засьвяціў запалку і Антось убачыў за перагародкамі двух вялізарных кныроў. Адзін з іх лена ўзьняўся, захрукаў дабратліва і пагоджана, потым зноў паклаў кірпаты свой лыч на салому і цяжка-цяжка засоп.

— От наша багацьце, ідры іх маць, —зачараваны дзівоснымі гэтымі жывёлінамі, прашаптаў Андрэй.—Ведаеш, кладуся спаць, а тут вось нешта сьсе, трывога нейкая, заснуць не магу. Як апантаны ўсёадно.

— Што-ж думаеш, усякага бывае. А яны ў вас іёркшыры, золата. Сьцерагчы трэба.

— Тут яшчэ гэты самы... гіцаль паршывы бегае і вярзе немаведама што... «Агонь бяжыць, баба бяжыць», —перакрывіў Андрэй дурня, што толькі-што сустрэўся па дарозе.

Шырокая пляма, нібы сьвежа вырабленая аўчына, ляжала на небе,— гэта месяц зайшоў за воблака, што— са спаважным неўтрапеньнем, павольна — плыло на ўсход. Антось зірнуў на неба і падумаў: «У самы рэз прыехаў... Ну, і ноч...».

— Я от мяркую іх у варыўню перагнаць... Усё спакайней будзе, — сказаў Андрэй.—Ну, а цяпер пойдзем у хату, маладзіца мая наказвала цябе прывесьці...

— Эйш, які ты, нават і не пахваліўся, што ажаніўся!

— Хіба маці не казала?

— А нічога, — у антосевым голасе прагучэла зьдзіўленьне. — «І сапраўды, чаму маці не сказала?»—падумаў ён.

— Ааа, — працягнуў дзіўным нейкім тонам Андрэй.

Узыходзячы на ганак, на які выходзіла асьвятлёнае вакно, якое гэтым часам было расчынена, Андрэй голасна сказаў:

— Ну, гаспадынька, гасьцей дарагіх пераймай.

Сказаў і чамусьці зарагатаў.

Як расчыніліся дзьверы, Антось на хвіліну ўрос у падлогу, ушчэнт зьдзіўлены і здэтаваны. насустрач ішла маладая і да болю дарагая яму жанчына.

Андрэй забавіўся ў сенцах, [illegible]

Першы зьезд Крывароскай організацыі ВУСПП

29—31 сакавіка г. г. у гор. Крывы Рог адбываўся першы зьезд крывароскай організацыі ВУСПП, на якім удзельнічала каля 200 дэлегатаў (з іх—130 чалавек непасрэдна з вытворчасьці, рабочыя-гарнякі крывароскага басэйну, закліканыя ў літаратуру).

Скліканьне зьезду супала са сьвяткаваньнем пяцігодзьдзя ВУСПП—«Маладняка» і двухгодзьдзя Крывароскай організацыі ВУСПП.

На зьезьдзе бралі ўдзел: загадчык аддзелу літаратуры і мастацтва Культпропу ЦК КП(б)У тав. **Ганс**, сакратар ВУСПП тав. **Кірыленка**, прадстаўнік таварыства драматургічных пісьменьнікаў тав. **О. Досьвітны**, прадстаўнік аб'яднаньня «Західня Україна» тав. **І. Ткачук**, прадстаўнікі Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў т. т. **С. Ліхадзіеўскі** і **П. Швэйдэль**, прадстаўнікі вуспаўскіх організацый Дніпрэльстану, Мікалаева ды інш.

Зьезд заслухаў даклад ВУСПП тав. І. Кірыленка пра перабудову работы ВУСПП і садаклад сакратара Крывароскай організацыі ВУСПП тав. Л. Юхвіда пра работу організацыі:

Да зьезду выдадзены спэцыяльны нумар часопісі «Кривбас», літаратурная старонка ў газэце «Червоний Гірник», «Тэмпы вирішають» ды інш.

Зьезд заслухаў цэлы шэраг рапартоў ударных брыгад гарнякоў-літгурткоўцаў імя Першага зьезду організацыі ВУСПП пра работу па разгрузцы Крывбасу ад запасаў руды.

Зьезд констатаваў значны ідэёвы і творчы рост організацыі за два гады работы.

На сёньняшні дзень вышлі паасобнымі выданьнямі наступныя творы членаў Крываросскай організацыі ВУСПП: роман «Вибух», нарысы «На життя»—Л. Юхвида, зборнік поэзіі «З рудяних надр»—М. Олійныка, аповесьць «Провокація»—П. Плахоття, зборнік нарысаў «58 днів» І. Штафэрука, кніжка нарысаў «Горячий сентябрь» М. Хазана.

Друкуюцца і неўзабаве выйдуць з друку: роман у двух частках «Ми», кіно-роман «В тихій долині», п'еса «Фронтовики» Л. Юхвіда, аповесьць «На коліях» О. Грышы, аповесьць «Шляхи» М. Хазана і інш.

Рэгулярна выдаецца штомесячнік Крывароскай організацыі ВУСПП «Кривбас».

Першы зьезд організацыі прайшоў пад знакам організацыйнага замацованьня і вялікай творчай актывізацыі. Работа зьезду прадэманстравала перад пролетарскай грамадзкасьцю ўсю масавасьць літаратурнага руху непасрэдна з асяродзьдзя рабочых-ударнікаў гарнякоў, паказала на тое, што для разгортваньня і ўмацаваньня работы організацыі ёсьць падзвычайна вялізарныя магчымасьці.

Выкарыстаць вопыт Крыварожжа

З залі яны падымаліся ў прэзыдыум і ўжо адтуль гаварылі:

— У падарунак зьезду мы адгрузілі 20 вагонаў руды...

— Вітаем зьезд адрамантаванымі вагонамі і паравозам...

— Літгурток пры цэнтральных майстэрнях імя «Комуніст» організаваў брыгаду токараў імя «Першага зьезду Крывароскай організацыі ВУСПП»...

Так віталі зьезд прадстаўнікі 26 літгурткоў, што яднаюць каля 300 рабочых-шахтароў Крыварожжа, закліканых у літаратуру.

Заклік распачалі год таму назад. Закліку спачатку замацаваць не змаглі: з 200 засталося працаваць толькі 90 чалавек. Ня было кіраўнікоў гурткоў, ня было дапамогі з боку грамадзкіх організацый.

Быў заслуханы даклад аб становішчы організацыі на Гарпарткоме. Літгурткі пашлі ў казармы, на рабочыя сходы, ставілі пытаньні аб культабслугоўваньні рабочых, аб стварэньні гарняцкай песьні. Па прапанове сакратарыяту Крывароскай організацыі ВУСПП літгурткі будуць у бліжэйшы час праводзіць шырокія рабочыя сходы на тэму «Аб чым пяе гармонік».

Побач з масавай работай гурткі шырока разгарнулі творчую работу. З 300 таварышоў 120 друкуюцца ў часопісах і газэтах. Гурткі выпускаюць спэцыяльныя літаратурныя насьценгазэты, часопісы. Кіраўнікамі гурткоў працуюць найбольш выяўленыя гурткоўцы. З мэтай падвышэньня іх кваліфікацыі яны былі прапушчаны праз спэцыяльныя Ўсеукраінскія 3-месячныя курсы.

Гэты вопыт трэба перанесьці і да нас. Пастанова сакратарыяту МенАПП пра гэта ўжо ёсьць. Стварэньнем такіх курсаў у Менску мы забясьпечым нашыя гурткі падрыхтаванымі кіраўнікамі.

Гурткі забясьпечаны жывым кіраўніцтвам з боку сакратарыяту. На сакратарыяце па чарзе абмяркоўваецца работа літгурткоў.

У цэнтры ўвагі ўсіх організацый Крыварожжа стаіць пытаньне аб разгрузцы басэйну ад запасаў жалезнай руды. І вось літгуртноўцы ўключаюцца непасрэдна ў гэтую важную політычную і экономічную задачу. На рудні імя «Кастрычніка» пад кіраўніцтвам літгуртка 60 грузчыкаў пішуць нарыс аб сваёй барацьбе і перамозе за адгрузку руды.

Між гурткамі заключаны сацыялістычныя ўмовы. Вось чаму ў парадку падрыхтоўкі да зьезду літгурткі сваімі сіламі адгрузілі 400 вагонаў руды.

Літгурткі Менску часта скардзяцца на тое, што да іх работы няма належнай увагі з боку грамадзкіх організацый. Але бясспрэчна і тое, што самі літгурткі (у прыватнасьці іх кіраўнікі) ня маюць патрэбнай ініцыятывы, ня ўмеюць разгарнуць свае работы на прадпрыемстве з тым, каб заваяваць сабе аўтарытэт. Яны часта варацца ў сваім уласным саку. Ніхто пра іх ня ведае, і яны нікога ня ведаюць.

Трэба вучыцца працаваць на прыкладзе Крываросскіх таварышоў.

П. Швэйдэль.

Конкурс п'ес на Украіне

Сэктар мастацтва Наркомасьветы Украіны абвясьціў вынікі конкурсу на п'есы. Журы літаратурнага конкурсу прэміявала такія п'есы: «На скелях казерна № 16» маладога пісьменьніка з Львова Івана Крушэльніцкага, «Земля горит» Аркадзя Любчанкі.

Далей цэлы рад аўтараў атрымалі нагароды па 500 рублёў за п'есы, якія могуць быць выкарыстаны для пастановак на малых сцэнах.

Сэктар мастацтва зазнаачае, што конкурс апраўдаў сябе, што конкурс прыцягнуў шмат новых аўтараў у большасьці з рабочых-ударнікаў і колгасьнікаў, а таксама і тых пісьменьнікаў, якія ўпяршыню ўзяліся за гэты жанр.

Вельмі цікавым зьяўляецца і тое, што актыўны ўдзел у конкурсе ўзялі аўтары акупаваных капіталізмам-фашызмам украінскіх земляў, а гэта яшчэ раз сьведчыць пра вялікі ўзрост аўторытэту Савецкай рэспублікі сярод рабочых, рэволюцыйнага сялянства і працоўнае інтэлігенцыі гэтых земляў.

В. С.

Алесь Зарыцкі

Ленінскі руднік

(Нарысы з паездкі інтэрнацыянальнай брыгады пісьменьнікаў у Крыварожжа)

Ленінскі руднік—гэта жменька катак крэйдавала колеру, пакінутых у стэпу. Стаяць рудыя горы адпрацаванай пароды.

Шумяць акацыі па ціхіх вулічках. Побач туляцца старыя падшахтныя будынкі. За будынкамі адараўенная,—на сто дваццаць мэтраў глыбіні,—яма руднічнага кар'еру.

Сьцены яе зьніжаюцца амаль проста пад кутом 75°—80°. На выбоінах у сьцяне прыляпіліся адколькі апаразаныя вяроўкамі. Чуцен нэрвовы грук пэрфаратараў, а далей выпаўзаюць на сонца штрэкі, норы штрэкаў 60-га гарызонту і корпаюцца скрэперы, заграбаючы сквапнай жменяй руду. Цераз год рудніка не пазнаеш.

Побач са старым падшахтным будынкам, дзе грымяць вагонкі з рудой і прапацелыя канагоны кляняць конскіх прэдкаў, заканчваецца пабудова комбінату, у якім зьмяшчацьмуцца: лямпавая, прыбіральня, мэдпункт і лазьня—прапусьнік на 650 чалавек ў зьмену. У гэтым годзе скончаць пабудову падшахтнага будынку з машынным і бункерным аддзяленьнямі.

Сёлета будзе здадзена ў эксплёатацыю цэнтральная шахта продукцыйнасьцю на адзін мільён шэсьцьсот тысяч тон жалезнай руды ў год, абсталяваная паводле апошняга слова тэхнікі. Гэта будзе. Заўтра. Але і сёньня руднік мае шэраг дасягненьняў і ідзе першым у Крыварожжы. Праведзена мэханічная па дастаўцы руды—скрэпэрызацыя, мэханізуюцца шпаркімі тэмпамі падземныя работы.

Яшчэ ў лістападзе 30-га году працавала толькі дзьве скрэпэрных лябёдкі, а ў ліпені 31-га году трынаццаць скрэпэраў. Мэханізацыя на 60 проц.—пастанова парткому.

Цяпер галоўная ўвага накіравана на выкарыстоўваньне ўнутраных рэсурсаў.

Уводзяцца рацыяналізатарскія ўдасканаленьні. Пагрузачныя пляцоўкі; рухомы пуць які дае магчымасьць перасунуць ваганетку да забою. Потым увядзеньне рэдукцыйнага кляпану ў сець паветраправоду; які падае сьціснутэе паветра да партовых горнаў, у якіх награюцца буры ў час іхняй запраўкі. Увядзеньне рэдукцыйнага кляпану дало магчымасьць трымаць нязьменчую тэмпэратуру для награваньня сталі, што мае вялікае значэньне і залежыць ад процэнтнай колькасьці вугляцу ў гэтай сталі.

Бур павінен быць трывалым і ня крышыцца; ён павінен мець 8,9 проц. вугляцу і тут проста неабходна ўхапіць вызначаную тэмпэратуру, што і робіць рэдукцыйны кляпан.

Усё гэта—вынаходкі маладога інжынэра-комуніста Івана Іванавіча Чуба—загадчыка горнымі працамі Ленінскага рудніка.

Галоўная чго вынаходка гэта новая сыстэма галоўкі бура, што павінна зрабіць рэволюцыю ў руда-дабывальнай прамысловасьці СССР.

Сам Іван Іванавіч Чуб—сын шаўца з Нікапольшчыны. Бацька аддаў яго ў гімназію пад іншым прозьвішчам. У гімназіі хлопчык пачаў сваволіць, у ім жыў дух протэсту, а тут «добылі», што Чуб сын селяніна і турнулі. Пайшоў на Пакроўскі марганцавы руднік шыць боты. Імпэрыялістычная вайна. У руднічным дэпо не хапала людзей і машыніст Аленьнікаў узяў яго за памагатага.

Чуб папрацаваў з тыдзень і пачаў агітаваць: — Хлопцы, за што працуем?

Сабраў трыццаць шэсьць подпісаў масьцеравых пад патрабаваньнем павышэньня пэнсіі на дзесяць капеек у суткі. Масьцеравыя кінулі працу. Чуб на чале.

Лютаўская рэволюцыя. Чуба абралі старшынёй Савету Рабочых і Сялянскіх Дэпутатаў. Гэтак да Кастрычніка. Потым пайшоў у партызаны. Сабраўся атрад—восемдзесят. Чуб быў начальнікам баявога штабу на станцыі Нікаполь. У атрадзе з ім быў Дуднічэнка (дырэктар Ленінскага рудніка); біліся з гайдамакамі і немцамі. Потым праца ў Чэка.

Потым Чуба як энэргічнага працаўніка кідаюць на слабыя месцы.

Ён быў начальнікам забесьпячэньня Крымскай арміі; загадчыкам савецкімі маёнткамі ў Ромнах. У двацатым годзе ён член Екацярынаслаўскага Выканкому. Потым зборшчыкам падаткаў; старшынёй «ўпрадкому»; начальнікам павятовай міліцыі; інструктарам земаддзелу і ўпаўнаважаным па забясьпячэньні галадуючых. У дваццаць трэцім годзе паступае ў Днепрапятроўскі Горны Інстытут.

Пасьля сканчэньня Інстытуту Чуб трапіў на шахту, дзе сустрэўся з старым таварышом па партызаншчыне Дуднічэнка.

Пры ўвядзеньні мэханізацыі рубам паўстала пытаньне наконт новага палепшанага стандартнага тыпу бура; які павінен адмяніць безьліч бураў разнастайных сыстэм.

Амэрыканцы раілі нам; як апошняе слова тэхнікі, бур запатэнтаваны амэрыканцам Кара, фірма Інгерсоль-ранд.

Паводле ацэнкі гэтага бура профэсарам Трушковым, гэты бур у паўночнай Амэрыцы на медзяных рудніках Штату Мічыган мае шэраг пераваг над іншымі сыстэмамі бураў;—дае адубальт. Але ў нашых умовах наўрад ці гэта можна было практычна зьдзейсьніць; таму, што гэты бур не падыходзіць да нашых пароў і патрэбна было выклікаць з Амэрыкі проектыроўшчыка, які-б вывучыў нашы пароструяваў новы бур для нас. Але справа ў тым, што штампы для запраўкі бураў мыг атрымлівалі ўвесь час непасрэдна ад фірмы Інгэрсоль-ранд (сакрэт фірмы); што; канешня; ўляцела-б ў капеечку. Але тут якраз і зьявіўся губаў бур, які вырашыў пытаньне ўдаленьня шматлікіх сыстэм бураў, якія ўжываюцца для розных парод, і павялічыў продукцыйнасьць працы ад 200 проц. да 500 проц. Зьнізіў колькасьць забітых бураў. Зьніжэньне колькасьці забітых бураў дае экономію на пагонны мэтр два рублі пяцьдзесят чатыры капейкі. Чубавы буры зьяўляюцца стандартнымі для руд моцных; сярэдніх і слабых.

Чубаў бур дасьць ленінскаму рудніку сто дзьве тысячы рублёў экономіі ў год. а калі ўлічыць экономію па амортызацыі струманту, дык болей за трыста тысяч рублёў ў год.

Вынаходка стала ўводзіцца з красавіка трыццаць першага году. Тут Чубу давялося стыкнуцца з консэрватызмам тэхнічнага пэрсоналу.

«Што ён за дзівака ламае? Дзядзька штукуе, мабыць;—хадзілі паганенькія гутаркі. Але Шуб дзейнічаў энэргічна. Праводзіў вынаходку загадамі. Сам браў бур у рукі, прывадзіў рацыяналізатараў, хронамэтражыстаў —«Убедитесь воочию». Рабочыя сталі просіць даць ім Чубаў бур, пераканаўшыся на практыцы ў выгаднасьці яго ўжываюць з вялікім посьпехам. Шлюць падзякі.

Суседні Божадараўскі руднік зрабіў быў спробу увесьці Чубаў бур, але яны няправільна зрабілі галоўку бура; а потым узьнялі вэрхал—«Чубаў бур нічога ня варты».

Давялося Івану Іванавічу самаму зьезьдзіць у Божадараўку і наладзіць справу.

На самым буйным Крываросскім рудніку—Кастрычніцкім—толькі рабілі досьледы з Чубавым бурам.

Канешна, не адны толькі вынадкі Чуба далі магчымасьць Ленінскаму рудніку перавыканаць прамфінплян на два процанты.

І партыйныя, і комсамольскія організацыі, і беспартыйныя рабочыя дружна; а часам і героічна; змагаліся за руду. За пяць месяцаў трыццаць першага году рабочыя далі сто пяцьдзесят дзве прапановы—сто трыццаць пяць выканана. З 2379 рабочых—1566 ударнікаў; 45 проц. замацавана да канца пяцігодкі.

Некаторыя ударныя брыгады дамагліся буйнейшых посьпехаў.

Брыгада крэпільшчыкаў імя ДПУ дала 267 проц.

Брыгада адкосчыкаў імя 518—1040 дала 209 проц.

Брыгада праходчыкаў імя Арцёма дала 168 проц.

І далей шэраг брыгад паказалі прыклады сапраўднай бальшавіцкай працы.

Апошнюю дэкаду ліпеня руднік сядзеў у прарыве;—не хапала рабочых—сталі скрэпэры (з прычыны нядбайных адносін да рамонту руднічных машын крываросскіх цэнтральных майстэрняў).

Выратавала руднік моладзь; комсамолія. Чатыры начы хлопцы пад кіраўніцтвам комсамольцаў Раюшкіна і Пасхалава штурмавалі шахту і ліквiдавалі прарыў.

У поўначы пайшоў дождж. Чарназём зрабіўся на гуміарабік. Ліпучая глеба прыстае да абутку вялікімі камякамі. Хмары прапаўзьлі цераз небакрай. Чорны стэп зьліваецца з зорамі.

Нейкі высозны плячысты чалавек з бескалярвовым зморзаным тварам і крутым падбародкам ідзе да рудніка. Гэта Сьцяпан Булах; загадчык шахты № 1, стары партызан. Яму ня сьпіцца. «Монаробылі що бэз мэнэ»,—мармоча ён, хлюпаючы ботамі.

Аднаго разу я з Булахам сыхадзіў у шахту. Ён павёў мяне ў дальні забой і мы хвілін дваццаць панура перлі па лужынах. Забой быў бяз крэпі. Са сталі сьцякалі струмкі вады, грaплялі за каўнер і перамажна каціліся далей. У кутку працаваў шахцёр. Шырокі скураны брыль, скураныя майткі і сьвітка блішчэлі ад вады. У руках тарахцеў пэрфаратар.

— От бачыш гэтага хлопчыка,—сказаў мне Булах. («Хлопчык» узьняў голаў і паглядзеў на мяне. У яго сівыя вусы і маршчакаваты твар, падобны на твар Максім Горкага).

— Ён, зедаеш, зусім нядаўна працуе на руднiку;—працягваў далей Булах. — Усяго дваццаць дзевяць год. Яго мы ўжо ў інваліды перавялі і пэнсыю прызначылі; з захаваньнем поўнага заробку;—а ён гаворыць:—«Хачу пяцігодку скончыць»,—і палез у шахту.

Датэрмінова выканалі плян 3-га квarталу

шахта № 1 2 ленінскага рудніка.

(Крывы Рог)

У газэце «Правда» ад 30 жніўня 1931 г. зьмешчана невялічкая заметка: За сухімі літарамі газэтнага радка мне бачны ўпарты Чубаў твар, маладыя вочы Рагожкіна і Пасхалава і начны стэп і хмуры стары партызан—загадчык шахтаў № 1 Сьцяпан Булах.

Прывітаньне ад таварышоў па змаганьні

«ЛІТІРАТУРНАЯ ГАЗЭТА» — орган ФАСП Украіны ў № 8 ад 21 сакавіка 1932 г. выдрукавала наступнае прывітаньне нашай газэце:

«Рэдакцыя «Літаратурнай газэты» вітае новага супольніка ў барацьбе за генэральную лінію партыі ў абсягу нацкультбудаўніцтва, за гегемонію пролетарскай літаратуры — орган фэдэрацыі аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва Беларусі — газэту «Літаратура і Мастацтва».

Савецкія пісьменьнікі Украіны, аб'яднаныя ў ФОРПУ, упэўнены, што «Літаратура і Мастацтва», пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выканае ўскладзеныя на яе партыяй і рабочай клясай задачы барацьбы за ленінскую нацыянальную політыку, за вялікае бальшавіцкае мастацтва, за стварэньне Магнітабудаў літаратуры.

Рэдакцыя «Літаратурнай газэты». (ХАРКАЎ).

Вучобу з ударнікамі на вышэйшую ступень

30 сакавіка ў Доме Пісьменьніка адбыўся інтэрнацыянальны зьлёт рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру. На зьлёце з дакладам пра далейшую працу з ударнікамі і творчую практыку маскоўскіх рабочых-ударнікаў выступіў **т. Аляхновіч.**

У сваім дакладзе т. Аляхновіч адзначыў, што вучобу з рабочымі-ўдарнікамі, закліканымі ў літаратуру, мы павінны ўзьняць на вышэйшую ступень. Не паслабляючы работу па далейшаму заклiку, колькаснаму росту літгурткоўцаў і літгурткоў,—мы павінны пайсьці па лініі замацаваньня існуючых літгурткоў, узьняць работу ў іх на вышыню ленінскай тэорэтычнай вучобы. Мы павінны дапамагчы рабочаму-ўдарніку цалкам авалодаць творчым мэтодам дыялектычнага матэрыялізму.

Вялікі недахоп у нашай рабоце з рабочымі-ўдарнікамі—гэта адсутнасьць да гэтага часу сталых вучэбных програм, стыхійнасьць ў занятках, адсутнасьць габінэту рабочых-ўдарнікаў пры Доме Пісьменьніка. Габінэт пры Доме Пісьменьніка організаваць неабходна. Габінэт ударнікаў павінен зьявіцца габінэтам, дзе рабочы-ўдарнік зможа атрымаць патрэбнае кіраўніцтва па творчых пытаньнях.

У спрэчках па дакладу выступілі тт. Кацовіч (яўрэйскі літгурток друкарні імя Сталіна), Нортман (бел. літгурток зав. імя Варашылава), Рабчынская (бел. літгурток друкарні імя Сталіна), Дзяхціар (яўрэйскі літгурток пры газэце «Юнгер Арбэйтэр»), Рак (яўрэйскі літгурток ф-кі «Кастрычнік»), Бацюшкоў (бел. літгурток зав. імя Молатава), Казлоўская (бел. літгурток фабзавучу КІМ), Ляпецкі (літгурток Будвуч), Мікуліч, Барашка, Алесін (БелАПП).

Выступаючы тт. указвалі на недaстатковае кіраўніцтва з боку МенАПП творчай вучобай рабочых-ўдарнікаў. Адсутнасьць програм, адсутнасьць сталай консультацыі, адсутнасьць пры МенАПП габінэту рабочых-ўдарнікаў стварае цяткасьці пры вырашэньні таго ці іншага творчага пытаньня, зрывае сыстэматычную вучобу.

На зьлёце паміж гурткамі і кіраўнікамі былі заключаны соцумовы: на глыбокую прапрацоўку пролетарскай літаратуры, на колькасны і якасны рост літгурткоў, на актыўны ўдзел у аглядзе маладзёжнай літаратуры, на актыўнае ўключэньне літгурткоўцаў у творчую дыскусію, на напісаньне гісторыі прадпрыемстваў і паказ герояў соцыялістычнай працы ды інш.

На зьлёце выступіў яўрэйскі пролетарскі пісьменьнік т. Сіго, што прыехаў з украіны Тав. Сіго ў сваім выступленьні падкрэсьліў, што БелАПП праводзіць вялікую работу з рабочымі-ўдарнікамі закліканымі ў літаратуру.

Выступленьне т. Мікуліча было прысьвечана пытаньням недастаковай увагі з боку пісьменьнікаў, белапаўцаў да рабочых-ўдарнікаў. Да гэтага часу яшчэ як сьлед не разгорнуты па рабочых літгуртках агляд маладзёжнай літаратуры. БелАПП і МенАПП недастаткова ўдзяляюць увагі гэтаму пытаньню. Тэорэтычная вучоба з ўдарнікамі знаходзіцца на нізкім узроўні.

У сваім выступленьні т. Барашка ўказаў на слабы ўдзел ў культурна-масавай рабоце нашых літгурткоў на прадпрыемствах. Літаратурны гурток павінен актыўна ўдзельнічаць у насьценгазэце і шматтыражцы, павінен быць праваднікам усіх політычна-культурных мерапрыемстваў.

Трэба лічыць недапушчальным амаль поўную адсутнасьць на зьлёце пісьменьнікаў белапаўцаў.

С. К.

Творчую дыскусію—на вышыню ленінскай тэорыі

(Шосты і сёмы вечар творчай дыскусіі ў МенАПП)

Творчая дыскусія, якая ўсё шырэй разгортваецца ў МенАПП і БелАПП, у асноўным ідзе па правільнаму шляху і яскрава сьведчыць пра ідэёва-творчы рост нашых пролетарскіх пісьменьнікаў і ўсёй БелАПП у цэлым.

Аднак, апошнія вечары дыскусіі, об'ектам якіх быў разгляд мастацкай продукцыі часопісі «Маладняк» за 1931 г., сьведчыць пра тое, што ў паасобных выступленьнях яшчэ бракуе бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, што паасобныя т.т. на дыскусіі спаўзаюць на няправільныя позыцыі: крытыкуюць творчасьць пісьменьніка не як цэлае, а, вырываючы паасобныя месцы з твору, даюць ім ацэнку зусім няправільную.

У выступленьні т. **Я. Скрыгана** цалкам адсутнічала бальшавіцкая самакрытыка. Скрыган, гаворачы пра творчасьць П. Броўкі, Ц. Гартнага, ні слова не сказаў пра сваю творчасьць, у прыватнасьці пра свае нарысы «Гомсельмаш», якія маюць буйнейшыя ідэолёгічныя зрывы, пра якія пісала «Зьвязда».

Гэта гаворыць пра тое, што Я. Скрыган зусім ігнараваў самакрытыку, на што зусім правільна зазначылі ў сваіх выступленьнях т.т. **М. Лынькоў і А. Александровіч.**

Непрынцыповым было выступленьне т. **С. Баранавых**, які гаворачы пра творчасьць **Іл. Барашкі**, адбіраў з яе толькі адмоўныя бакі, замазваючы дадатныя.

Больш таго, тлумачачы творчыя зрывы Барашкі, Баранавых скаціўся на зусім няправільныя позыцыі: зрывы ў творчасьці Барашкі ён тлумачыць тым, што пісьменьнік перагружаны грамадзкай работай. Гэтым, фактычна, адмаўляецца практычны ўдзел пісьменьніка ў справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднабока т. Баранавых крытыкаваў і творчасьць **Б. Мікуліча.**

Выступленьні **т.т. П. Броўкі, С. Ліхадзіеўскага, Б. Мікуліча ды інш.**, ня гледзячы на правільны ў асноўным падыход да разьбіраемых твораў, не давялі тэорытычнай ацэнкі тэй ці іншай зьявы, не заўсёды паказвалі на прычыну яе, не заўсёды рабілі абагульняючыя вывады.

Творчую дыскусію мы павінны праводзіць на глыбока-прынцыповай аснове, на ўзроўні ленінскай тэорыі. Творчая дыскусія ёсьць барацьба за авалоданьне сьветапоглядам пролетарыяту, за дыялектычна-матэрыялістычны творчы мэтад, за авалоданьне тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна. У аснову гэтай барацьбы павінна быць пакладзена бальшавіцкая крытыка і самакрытыка.

К. Б.

За стварэньне дзіцячай кніжкі, вартай нашай эпохі

Увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, барацьба за політэхнізацыю школы, за падвышэньне якасьці школьнай работы, за пагалоўны ахоп дзяцей працоўных піонэрорганізацыяй—усё гэта высоўвае неабходнасьць самага шырокага выкарыстоўваньня ўсіх сіл і сродкаў, якія могуць дапамагчы ў справе комуністычнага выхаваньня дзяцей.

Поруч з дзіцячым комуністычным рухам, школай і ўсім грамадзкім асяродзьдзем, дзіцячая кніга зьяўляецца важнейшай зброяй у справе формаваньня дзіцячай ідэолёгіі.

Дзіцяча кніжка, прасякнутая тэматыкай соцыялістычнага будаўніцтва, павінна дапамагчы выхаваць у дзецях якасьці чалавека, здольнага змагацца за канчатковае завяршэньне соцыялізму.

Барацьба за новыя мэтоды школьнай работы,, якія-б адпавядалі задачам політэхнічнай школы, высоўвае неабходнасьць паўнейшай ўвязкі паміж работай школы і дзіцячай кнігай, якая зьяўляецца неабходным матэрыялам як для прапрацоўкі ў школе, так і для па-зашкольнага чытаньня. Гэта высоўвае неабходнасьць увязкі мастацкай дзіцячай кнігі са школьнымі програмамі.

Між тым, адзначаючы пэўны зрух у справе стварэньня сучаснай дзіцячай кнігі, трэба сказаць, што значная частка дзіцячай літаратуры не адпавядае тым вялікім задачам, якія на яе ўскладае партыя і рабочая кляса.

Вось чаму ініцыятыва творчага агляду дзіцячай літаратуры, які абвешчаны рэдакцыяй «Піонэр Беларусі» і «Іскры Ільліча» трэба лічыць вельмі актуальнай і насьпелай. Агляд дзіцячай літаратуры зможа і павінен зрабіць значны зрух у справе стварэньня дзіцячай літаратуры.

Комісія па дзіцячай літаратуры пры школьнай сэкцыі ДзВС Наркомасьветы падтрымлівае гэтае пачынаньне, бярэ на сябе наступныя абавязкі:

Разгарнуць растлумачальную работу сярод асьветнікаў БССР па справе ўключэньня ў агляд дзіцячай літаратуры.

Наладзіць агляд школьнай бібліотэк з мэтай ачысткі іх ад політычна-нявытрыманых, шкодных і ўстарэлых кніжок.

Шырокімі коламі асьветнікаў правесьці збор матэрыялу для агляду дзіцячых кніжок, для чаго дасылаць раёнам конкрэтныя заданьні.

Комісія па дзіцячай літаратуры пры ДзВС выклікае Навукова - Дасьледчы Інстытут і ВПІ заняцца справай вывучэньня дзіцячых кнігі для рознага ўзросту.

У часе агляду крытычная сэкцыя БелАПП павінна выступіць з радам артыкулаў ў пэрыодычным друку па пытаньнях дзіцячай літаратуры як па аглядзе продукцыі БДВ, так і па аглядзе творчасьці паасобных пісьменьнікаў.

Лічучы, што продукцыя нашых пісьменьнікаў у галіне дзіцячай кніжкі далёка недастатковая, комісія заклікае БелАПП у часе агляду ўдарна ўзяцца за стварэньне дзіцячай кніжкі, для чаго сэкцыі дзіцячай кніжкі БелАПП шырока разгарнуць работу па ўцягненьні пісьменьнікаў, рабочых - ударнікаў, пэдагогаў і мастакоў у справу стварэньня дзіцячай кнігі, вартай нашай эпохі.

Комісія па дзіцячай літаратуры пры школьнай сэкцыі Дзярж. Вуч. Сав. НКА.

Наша дэкада

⊙ Да сьвяткаваньня 1-га Мая колектыў БДТ—І рыхтуе карнавальную групу. Вылучана брыгада з т.т. **А. Рамановіча, Міровіча, Д. Крэйна П. Данілава, С. Бірылы,** якая распрацавала плян гэтай групы.—Тэма «за завяршэньне пяцігодкі ў чатыры гады». Матэрыял—выкананьне промфінпляну заводамі «Бальшавік», «Кастрычнік», шчотачнай ф-кай «імя Крупскай» і «Варашылава».

⊙ Гэтымі днямі ў МенАПП адбудзецца вечар **крытыкі крытыкаў** БелАПП. Для прапрацоўкі крытычных артыкулаў вылучаны 4 брыгады.

⊙ Пісьменьнік **В. Каваль** у № чырвонаармейскім палку г. Барысава організаваў літаратурны чырвонаармейскі гурток.

⊙ У хуткім часе здаецца ў друк другі альманах творчасьці рабочых ударнікаў Менску «Ударнікі».

⊙ На поэтычную нараду РАПП БелАПП вылучыў брыгаду ў складзе т.т. **Хведаровіча Куляшова і Кучара.**

⊙ Распачата падрыхтоўчая работа па скліканьню 1-ай конфэрэнцыі Гомельскай АПП.

⊙ 15 красавіка БДТ—2 (Магілёў) паказаў прэм'еру «Вясна»—**М. Ільлінскага.** З 23 красавіка пойдзе п'еса «Напор» **Александровіча.**

⊙ Бюро Магілеўскай АПП ўстанавіла сувязь з БДТ—2. Ладзяцца вечары творчай дыскусіі пра пастаноўкі тэатру.

⊙ **М. Чарот** здае ў ДВБ для друку 1 і 2 том (поэзія) і 3 том (проза) поўнага збору сваіх твораў.

⊙ МенАПП падрыхтоўвае шырокую творчую нараду асоцыяцыі па наступных пытаньнях:

1) Падрыхтоўка да XV гадавіны Кастрычніка; 2) Пра далейшую працу з рабочымі-ўдарнікамі. 3) даклад літгуртка друкарні імя Сталіна, ды інш.

⊙ 10 красавіка на актыве Драмтаварыства т. **М. Блісьцінаў** чытаў сваю п'есу «Грунт».

⊙ Гэтымі днямі выходзіць з друку зборнік вершаў **Андрэя Александровіча** ў перакладзе на польскую мову.

⊙ БДТ—І у канцы мая выяжджае на гастролі ў Гомель і Магілёў.

⊙ З гэтага году БДТ—І організуе тэа-фабзавуч з 2-х гадовым курсам навучаньня.

⊙ У маі месяцы Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр БССР прыступае да пастаноўкі п'есы «Напор» Александровіча. П'есу пераклаў поэт З. Аксельрод. Ставіць п'есу рэжысэр т. Літвінаў.

⊙ Да XV гадавіны ДВБ выдае антолёгію беларускай пролетарскай літаратуры.

⊙ Здадзены ў друк другі альманах —**БелЛАЧАФ».** У альманаху значна прадстаўлена творчая продукцыя пісьменьнікаў-чырвонаармейцаў.

⊙ **Іл. Барашка** напісаў п'есу з цыганскага жыцьця пад назвай «Романы Зоря».

⊙ Выйшла з друку поэма **І. Харыка** «Бесьперапынка».

⊙ У першай палове мая—БДТ—І пакажа прэм'еру «Пляцдарм»—украінскага пісьменьніка т. **Ірчана.**

Пра мову ДВБ

З боку некаторых пісьменьнікаў часам чуюцца галасы нездавальненьня «мовою ДВБ». Некаторыя пісьменьнікі іронічна называюць стыльрэдакцыю ДВБ «кухняй мовы» і жорстка «крыюць» некаторыя, часам, можа і ня зусім удалыя, нэолёгізмы.

Не прэтэндуючы на «высокую» годнасьць ні «кузьні» мовы (як некалі любілі называць Інбелкульт і Выдавецтва некаторыя добрадзеі і ягомасьці стыльрэдакцыя ДВБ праводзіць цяжкую і адказную штодзенную работу, вымушаную асаблівасьцямі ўмоў дзейнасьці ДВБ разьвязваць, часам, надзвычайна складаныя і цяжкія тэрмінолёгічныя пытаньні, якія патрабуюць папярэдняга глыбокага вывучэньня і навуковага абгрунтаваньня, у той час, як тэрмінолёгічная справа яшчэ далёка не ўпарадказала, калі інстытут мовазнаўства БАН у выданьні слоўніка ідзе самымі марудлымі тэмпамі (разасланы для абмеркаваньня матарыял толькі на першыя пяць літар пры чым гэты матэрыял мае шмат спрэчных слоў) —і ўсё гэта ў той час, калі жыцьцё ідзе сямімільнымі крокамі наперад, калі Выдавецтва павінна выпускаць без затрымкі штодня не адзін дзесятак аркушоў самай актуальнай, самай тэрміновай літаратуры.

Сувязь ДВБ і БАН пакуль што абмежавалася добрымі пажаданьнямі ды намерамі,—і не па віне ДВБ, бо звароты стыльрэдакцыі ў БАН па пытаньнях тэрмінаў і некаторых слоў засталіся без адказу з боку БАН. Яны, бачыце, «слоў на гэтую літаратуру яшчэ не разглядалі». Так, напр., катэдра хэміі адмовілася даць дакладную ўстаноўку для ўжываньня тых ці іншых тэрмінаў бо ў іх, бачыце, «гэта яшчэ ня ўзгоднена з тэрмінолёгічнай комісіяй»... А ў Выдавецтве ляжаць падручнікі і не чакаюць, пакуль паасобныя інстытуты БАН будуць узгадняць паміж сабою словы і тэрміны.

Сувяз-ж паміж ДВБ і пісьменьнікамі ажыцьцяўляецца амаль выключна праз... бухгальтэрыю ДВБ. Гэтым пакуль уся сувязь пісьменьнікаў з ДВБ і абмяжоўваецца.

Тт. пісьменьнікі! Стыльрэдакцыі патрэбна і вельмі патрэбна крытыка і крытыка сапраўдная, а не крытыканцтва; стыльрэдакцыі патрэбна дапамога, а ня кпіны і зубаскальства з боку паасобных пісьменьнікаў; стыльрэдакцыі патрэбны вашы зоды і вопыт, а не абразьлівыя празваньні і мянушкі; стыльрэдакцыі патрэбны новыя трапныя словы нашага соцбудаўніцтва, нашага сёньня.

Н-ч.

Пастанова

нарады культпропаў і старшынь літгурткоў колектываў і ячэек КСМ гор. Менску пра ход творчага агляду маладзёжнай літаратуры

(Зацьверджана бюро гаркому КСМ)

Заслухаўшы даклад тав. Мікуліча і садаклад культпропаў: комітэту КСМ заводу Варашылава, комітэту КСМ друкарні Сталіна, колектыву заводу Молатава пра ход творчага агляду маладзёжнай літартуры, нарада культпропаў КСМ колектываў і старшынь літгурткоў адзначае:

1. Творчы агляд маладзёжнай літаратуры разгорнуты па гарадкой організацыі ЛКСМ нездавальняюча. У гэтай рабоце адсутнічае належная масавасьць і сыстэматычнасьць. Шэраг ячэек КСМ недаацэньваюць політычнай сур'ёзнасьці закліку ўдарнікаў у літаратуру, не паставілі перад сабой гэтую задачу, як адну з баявых работ у барацьбе за культуру, нацыянальную па форме і соцыялістычную зьместам. З боку БелАПП і МенАПП яшчэ няма разгорнутых мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі актыўны ўдзел літаратурных работнікаў у правядзеньні творчага агляду маладзёжнай літаратуры.

2. Існуючыя па паасобных колектывах і комітэтах літаратурныя гурткі яшчэ не наладзілі сталай творчай вучобы і грамадзка - політычнай работы на вытворчасьці, а некаторыя гурткі нават распаліся (зав. Молатава). Факты добрай работы комсамолу ў літгуртках (зав. Варашылава, друкарня Сталіна) недастаткова популярызуюцца праз друк для ўсёй організацыі.

3. Зусім амаль не разгорнуты творчы агляд нацменаўскай маладзёжнай літаратуры (яўрэйскай, польскай і расійскай), што ў значнай ступені зьяўляецца вынікам неўключэньня ў гэтую работу адпаведных сэкцый МенАПП, а таксама недастатковай работы ў гэтым кірунку з боку КСМ колектываў на мясцох.

Нарада лічыць неабходным:

1. Устанавіць канчатковы тэрмін правядзеньня творчага агляду маладзёжнай літаратуры да 15-V 1932 г., разгарнуць зараз-жа масавую работу вакол гэтага мерапрыемства па ўсёй організацыі КСМ, лічачы гэту работу адным з баявых вучасткаў у падрыхтоўцы і правядзеньні абмену КСМ білетаў.

2. Політычная кампанія па абмену КСМ білетаў павінна ўзьняць на больш высокую ступень сумесную работу комсамолу з пролетарскім літаратурным рухам. Комсамольцы - літгурткоўцы, атрымліваючы новы комсамольскі білет, павінны ўзяць на сябе шэраг абавязкаў па ўздыму творчай і політычнай дзейнасьці літгурткоў, і паасобных літгурткоўцаў.

3. Для наладжваньня конкрэтнага кіраўніцтва творчым аглядам маладзёжнай літаратуры і абмену вопытам работы практыкаваць скліканьне адзін раз у месяц нарад культпропаў колектываў і ячэек КСМ (па вытворчым прынцыпе) па паасобных пытаньнях творчага агляду і закліку ўдарнікаў у літаратуру.

4. Комітэтам, колектывам і ячэйкам КСМ на працягу агляду маладзёжнай літаратуры разгарнуць масавую работу на прадпрыемствах: літаратурныя вечары, дыспуты па агляду паасобных твораў комсамольскай літаратуры, гутаркі па цэхах, выпуск літстаронак у газэтах і г. д., прыцягваючы да гэтай работы ўсіх комсамольцаў і шырокія масы рабочай моладзі.

5. У правядзеньні творчага агляду маладзёжнай літаратуры, а таксама ў штодзённай рабоце літгурткоў шырока разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва. На бліжэйшай нарадзе правесьці заключэньне соцумоў паміж літгурткамі і літгурткоўцамі на палепшаньне творчай і грамадзкай дзейнасьці ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

6. У дэкадны тэрмін па ўсіх колектывах і ячэйках КСМ праверыць выкананьне ўзятых абавязкаў у «Дзень пролетарскай літаратуры», асьвятляючы вынікі гэтай праверкі ў мясцовым друку і ў «Чырвонай зьмене» і «Юнгер арбайтэр».

7. Адначасова разгарнуць творчы агляд нацменаўскай маладзёжнай пролетасркай літаратуры, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу ў гэтай рабоце адпаведныя сэкцыі МенАПП і газэты.

8. У мэтах популярызацыі творчага агляду маладзёжнай літаратуры і прыцягненьня да яго вясковай часткі організацыі, правесьці да І мая куставыя сходы вясковых ячэек па гэтым пытаньню, уключыць у конкрэтную работу па творчаму агляду буйнейшыя саўгасныя і колгасныя ячэйкі. Прыцягнуць для дапамогі ў гэтай рабоце аб'яднаньне пролетарска - колгасных пісьменьнікаў.

9. Комітэтам, колектывам і ячэйкам КСМ наладзіць заслухоўваньне дакладаў літгурткоўцаў - комсамольцаў, усямерна ім дапамагаючы ў іх творчай вучобе і рабоце. Лічыць іх работу як адну з асноўных комсамольскіх нагрузак.

10. У мэтах лепшага ўключэньня нізавога друку ў агляд маладзёжнай літаратуры Гаркому разам з газэтай «Ч. З.» і «Ю. А.» правесьці па гэтаму пытаньню нараду рэдактароў комсамольскіх старонак - шматтыражак.

11. Для сыстэматычнага кіраўніцтва творчым аглядам маладзёжнай літаратуры скласьці гарадзкі штаб пры Гаркоме комсамолу ў складзе тт. САДОЎСКАГА (ГК КСМ), МІКУЛІЧА (ЯЧЭЙКА ЛКМСБ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ), ШВЭЙДЭЛЯ (МенАПП), ВЯРНІКОЎСКАГА («Ч. З.»), ШУЛЬМАНА (ДРУКАРНЯ СТАЛІНА), ФІГЛОЎСКАЙ (БАН) і ЭСТЭРКІНА (ЗАВОД ВАРАШЫЛАЎ). Гарштабу ў дэкадны тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы сваёй работы.

Прасіць ЦК ЛКСМБ узьдзейнічаць на цэнтральны штаб па кіраўніцтву творчым аглядам маладзёжнай літаратуры, які не праводзіць ніякай работы.

Адказны рэдактар Х. ДУНЕЦ
Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

Друкарня імя Сталіна, Менск

Галоўлітбел № 575